Анатоль Крэйдзіч

Права на ўсмешку

Апавяданні

Мастак Наталля Салаўёва

Крэйдзіч Анатоль нарадзіўся ў 1965 годзе ў вёсцы Заверша на Драгічыншчыне. Скончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Працуе загадчыкам аддзела ў іванаўскай раённай газеце "Чырвоная звязда". Апавяданні друкаваліся ў "Маладосці", "Першацвеце", "Чырвонай змене" і іншых рэспубліканскіх выданнях. Лаўрэат прэміі часопіса "Маладосць"

Ужо сваімі першымі апавяданнямі, якія былі надрукаваны ў часопісе "Маладосць", Анатоль Крэйдзіч звярнуў на сябе ўвагу чытача. Малады празаік піша аб тым, што яму баліць, што хвалюе, што добра ведае. А ведае ён перш за ўсё вясковае жыццё, бо і сам жыве ў палескай глыбінцы з дзяцінства, працуючы журналлістам, бадай, ці не кожны дзень сустракаецца з хлебаробамі. Па-маладому свежа і хораша, напрыклад, напісаны апавяданні "На горцы", "Хуліган", "Вар'ят", "Ерчыкаў слуп". Элементамі навізны, трэба зазначыць, вызначаюцца і творы, прысвечаныя каханню. Анатоль Крэйдзіч прафесійна валодае сюжэтам, мова яго апавяданняў, як правіла, сакавітая, па-сапраўднаму , беларуская, і ў гэтым сэнсе кніга прозы "Права на усмешку" павінна мець заслужаны поспех і прызнанне.

На горцы

Апошні вяз змагаецца за свае жыццё асабліва ўпарта.

— Жыловаты, чорт,— выдыхае дзед Васіль і адпускае ручку пілы. Яе вострыя зубы ўжо зраўняліся з процілеглым надрэзам. Але дрэва не падае — настойліва чапляецца амаль што голымі галінкамі за нізкія белыя аблачыны, цягнецца ўгару, не верачы ў непазбежнае.

— Здаецца, о то во недаўно садзіў, а ўгэ, бачыш, як выцягнуліса,— працягвае дзед і дастае з зашмальцаванай кішэні куфайкі сцёрты пачак «Астры»...

— Шкада, мабыць, дрэў? — уключаюся ў размову.

— Гэтых не шкода. Нема за што іх шкодоваць: заглушылі бэрэзняк только. Сільно сокі цягнуць.

— Не верыцца, што гэтае дрэва маладзейшае за вас. Калі б гэта вы пра бярозы сказалі, дык лягчэй было б паверыць. Яны і з выгляду маладзейшыя, і ростам ніжэйшыя. А гэты ж — ого які — багатыр.

Задзіраю галаву, каб пабачыць вяршаліну вяза. Старая вушанка, якою надарыў мяне дзед, не ўтрымліваецца на галаве, коціцца па схіле горкі, прымінае яшчэ не зляжалае апалае лісце.

— Гм... Якое ж тут дзіво. Горка то тожэ шэ молодая, не злежалая. Ее бульдозер нагроб: усёй плодородны слой звэрнуў з тое стороны. А на плодородной да рыхлой земле тобе шчо хоч выросце. І бэрозы пошлі б у рост, але шчо в'язы іх опэрэдзілі, а потом і заглушылі. Ну, нічо, будзе ім цепэр слобода.

Аглядаю горку. Мілы жывы куточак. Непадалёку, сярод белых сцвалоў бяроз, мільгаюць каробачкі вулляў... Цяпер, аднак, пустыя: летам бліжэйшыя да гэтай мясціны палі апрацоўваліся ядахімікатамі. На адной з бялюткаствольных прыгажунь свеціцца дзіркамі сарочынае гняздо. Процілеглы бок горкі парос мяккім пушком маладога бяразнічку. Там таксама шмат гнёздаў. Жывуць на горцы і вожыкі, і курапаткі, і шмат іншай жыўнасці. Іх тут ніхто не трывожыць. А на месцы, дзе спынілася мая шапка, пачаў выразна праяўляцца мурашнік: невялічкі карычневы конус з даірачкамі-хадамі, з якога вытыркаецца кавалачак пянька.

Крокаў за дваццаць адсюль — хата дзеда Васіля. Непадалёку задраў у гару шыю высокі калодзежны журавель.

Мой субяседнік суха плюе на цёмную, загрубелую ад нялегкай вясковай працы руку, упэўнена ашчшаперваe ёю крывую драўляную ручку пілы. Мы моўчкі прасыпаем па абодва бакі дрэва жаўтавата-белыя апілкі. Вяз нарэшце здаецца. Шкрабянуўшы колькі разоў

кастлявай вершалінай па вялізнай сівой аблачыне і не адчуўшы падтрымкі, падае, стогнучы ад болю, на мёртвы асенні дол.

— Машына дроў,— заключаю я, аглядаючы зваленыя дрэвы.

— Так шо й будзе,— згаджаецца дзед Васіль.— Только мало од іх толку, од в'язовых дроў. Не яркіе воны. Паліш-паліш, а печ холодная. В'яз на дрова не годзіцца: его і рэзаць трудно, і колоць...

— Дык, можа, яго ў будаўніцтве можна выкарыстоўваць?

— В'яза? Э-э-э, які з его строймацер'ял. Не, угэ лепш на дрова.

— Дык што ж ён — зусім нікудышняе дрэва?

— Чому нікудышнее? Дзерэўеў непотрэбных нема. Только трэба ведаць, якое дзе іспользоваць. В'язом добра дорогі обсаджваць — крэпкі вон сільно: ніякая бура его не зломіць. А як шэ лапці плелі, то лыко з его было хорошэе. У сухую погоду в'язовые постолы моглі выходзіць цэлы месяц. Але ўгэ на болото іх не обуеш, там лепш лозовые носяцца.

Дзед зноў дастае «Астру» і запалкі. Закурвае. Аглядае зваленае дрэва і, мабыць, намеціўшы ў галаве план далейшых дзеянняў, цягнецца да сякеры. Ён не спяшаецца, а таму рухі яго дакладныя, упэўненыя, беспамылковыя... Не, гэта рухі не ворага прыроды, не бяздумнага лесапавальшчыка, не сквапнага хапугі... Гэта рухі гаспадара. Ён не піліць дрэвы, не нішчыць іх... Ён вызваляе ад палону вязавых крон беразняк, а ад іх каранёў — поле, што раскінулася ля самага падножжа горкі зялёна-карычневай шчоткаю сеянкі.

Тут жа, на мяжы, ля самай горкі, тоненькаю стужачкаю выгнулася шэрая, цвёрдая сцяжынка. Па ёй звычайна праязджае паштальён з рудою патрэсканай сумкаю на баку.

Вось і цяпер ён раптоўна выплыў з-за хмызняку, што прыцерусіў адзін з бакоў горкі, спыніўся, прыкмеціўшы нас, і я пачуў ягоны ахрыплы ад курэння голас.

— Васіль, го Васіль, ходзі забірай свое газеты.

Я падбягаю да яго і забіраю працягнуты скрутак. “Раёнка” і “Труд” — уся пошта.

— Чытаеце раённую газету? — цікаўлюся.

— Пробоваў. Але многіе слова не понімаю. У нас тут язык трошэчкі другі. Бывае, такіе слова попадуцца, шчо і смысл усёго чытання поцераеш. Я ж у белорускай школе не вучыўся. От польскую газету ўгэ чытаў бы лягчэй, бо вучыў польскую грамацыку.

— Гэта яшчэ пры Польшчы?

— Ага, пры Польшчы. Чотыры класы кончыў.

— Ясна,— выдыхаю я, хаця адчуваю, што яснага тут мала. Але больш глыбока прааналізаваць словы дзеда Васіля не дае раптам

узнікшая аднекуль музыка. «Ещё-о раз...» — ловіць вуха абрыўкі знаёмай песні, якую даносіць да нас парывісты, як быццам бы знерваваны, вецер.

Азіраемся на гукі. З дарогі да суседняй хаты збочвае расхрыстаны хлопец з магнітафонам у руцэ. Ен, па ўсім відаць, пяны, бо са словамі песні “Ещё-о раз...” намагаецца ступіць нагою ў зададзеным напрамку, але ў яго гэта ніяк не атрымліваецца, і чалавека кідае то ў адзін, то ў другі бок, як быццам ідзе ён не па цвёрдай замлі, а па палубе карабля, якая так хістаецца пад нагамі ад набягаючых хваляў, што спасу няма.

— Ну, давай,— смяецца дзед Васіль,— ешчо раз ступі, так, так, ну, ешчо раз... От ідзе паскуда, а не хлопэц.

І ён расказвае мне пра тое, як гэты самы юнак некалькі гадоў назад застрэліў бусла, што жыў на вялізным вязе каля іхняй хаты. Пасля таго тут пасялілася новая пара птушак. А гняздо — вунь яно, бачна адсюль — з горкі. Дзед не можа не ўспомніць пра тое здарэнне.

— Моя Настаха,— гаворыць ён, шчурачыся ад цыгарэтнага дымку,— после того, як у гнезда появілаcа другая пара буськоў, побачыла ёго да кагэ «Залезь на дзерэво э ножоўкою, позрэзнай тыя голіякі, шо понаросталі над гнездом, бо птушкам садзіцца плохо. Коб крый Божэ эусім не злецелі». Хоцела напужаць, шо як не позрэзвае, то нешчасным на ўсю жызнь останецца. Але дзе там. Слухаць не захоцеў. Такого напужа-аеш. Нічо не боіцца, зараза этая.

— А хто ж пазрэзваў галінкі? — Гісторыя мяне зацікавіла.

— Унук позрэзваў — Колька. Золоты хлопэц.— Дзед Васіль ажывіўся, маршчыны на ягоным твары засвяціліся цёпла і пяшчотна.— Недаўно ночоваў у нас. І якраз у той вэчор под страху прылецеў дзяцел дай давай барабаніць у дылю. Чы то корміўса, чы обвешчаў родзічам, шчо тут ёго ўладзенія, хто ёго ведае. А Колька слухаў-слухаў, дай пытаецца, шчо то грукаецца ў сцену. Кагом, это смэрць угэ пробіваецца церэз сцену до нас. То той хлопэц — ледзь розвіднело — скорэй поставіў до сцены дробіны, узяў бляху, гвоздзі, молотка і забіў тэ место, дзе дзяцел подзёўбаў. Гэтак ратоваў нас од смэрці. О, гэто хлопэц. Выросце — Человеком будзе. А то-о-о...

Дзед махнуў рукою, выпусціў з пальцаў маленькі акурачак.

Мяне ж зацікавіла, ці спраўдзіўся прагноз бабкі Настассі наконт забойцы бусла. І я запытаўся пра гэта ў свайго памяркоўнага субяседніка.

— Можно сказаць, шчо і спраўдзіўся. Почці одразу после того случая покінула ёго жонка, а далей спіўса. Бачыў жэ, які йшоў. Цепэр вон почці кажды дзень такі ходзіць. Быў дурны, а цепэр, як спіўса, і

шчэ дурнейшы стаў. Недаром жэ ж кагуць, шчо од п'яного і дурны ўцекае. А жызнь такая штука, шчо як хочэ, так і повэрне. Оно поддайса ёй.

Я падумаў, што дзед Васіль ніколі не паддаваўся. Ен сам варочаў жыццём, як яму трэба было, нікому і нічому пры гэтым не замінаючы. Таму і мае права даваць ацэнку іншым.

Падумалася і такое: якія ж мудрыя, разумныя, чалавечныя нашы старыя.

І раптам быццам найшло прасвятленне: гэта ж такі разумны і мудры мой народ.

Хуліган

У кішэні дабяла пацёртых джынсаў сціснуўся пакамечаны трояк. Ён не шалясціць нават тады, калі хлопец ад няма чаго рабіць бязлітасна скубе яго спрытнымі музычнымі пальцамі, запіхвае на самае дно скуранога капшука для ключоў і іншай патрэбнай і непатрэбнай дробязі. Нядаўна ў кішэні гэтак жа пакутліва бавіла час пяцёрка, але яна перабралася ў партманет невядомага гандляра-бэйбуса ў абмен на загадкавыя рублёвыя газеты, і вось цяпер застаўся знябожаны старэнькі трояк.

Хлопец прыпомніў, як пасля заняткаў сабраўся з сябрукамі павячэраць у студэнцкай сталоўцы, але ў апошні момант перадумаў, пайшоў блукаць па горадзе. Яму заўсёды да нудоты прыкра слухаць, як студэнты таргуюцца, дамаўляюцца між сабою, каб не пераплаціць лішнюю капейку, танней паесці, плануючы выдаткі на месяц уперад.

Ён жа альбо жыў, як кажуць, на шырокую нагу, альбо дыбаў на цыпках, перабіваючыся з вады на хлеб. Іначай не ўмеў.

Заўтра ў інстытуце культуры, дзе ён вучыцца, — выдача стыпендыі, і трояк, які ляжыць у кішэні, просіцца, аж пацее, на волю. А вось, здаецца, якраз тое месца, дзе можна патрaціцца. Маленькая экспрэс-кавярня на рагу вялізнага каменнага будынка запрашае элегантнай некрыклівай шыльдаю.

...Праз хвіліну здаровы бармен з халодным абыякавым тварам ужо грэе на гарачым пяску чорны духмяны напітак, падае ці не ўчарашнія, падсохлыя зверху, бутэрброды. Юнак нетаропка пераносіць ежу на паліцу, якая тут замест століка, падсілкоўваецца, аглядаючы адначасова сваіх суседзяў. Іх тут няшмат — дзве дзяўчыны і двое па-вясковаму апранутых мужчын. Большую колькасць наведвальнікаў гэты малюсенькі пакойчык змясціць не мог пры ўсім жаданні яго гаспадара.

Дзяўчаты смаляць цыгарэты, збіваючы попел у кубачкі з-пад кавы. Стройныя, у кароценькіх светлых куртках і такіх жа кароценькіх спаднічках, быццам выстаўляючы напаказ прыгожыя ногі, адцененыя чорнаю сетачкаю калготаў, праз якія прасочваецца моцны васковы загар, яны вымушаюць спыніць на сабе позірк.

Юнаку такое суседства не падабаецца. Здаецца, глядзяць тут на яго як на выпадковую казяўку — пры ім можна гаварыць усё, што хочаш, не турбуючы сябе выбарам слоў.

— Што ты за чалавек, Пятровіч? Ужо ж стары, а да дзяўчат яшчэ ласы, — звініць нахабным смехам маладзейная, тузаючы субяседніка за крысо паліто.

Той задаволена рагоча:

— З такімі прыгажунямі я адчуваю сябе зусім юным. Вунь як гэты пацан.

— Дзяўчаты зыркаюць на хлопца і душацца ад смеху. Ён чырванее.

Захацелася раптам выскачыць на вуліцу, дыхнуць свежага паветра.

Другі мужчына хваліўся, што ён самы галоўны ў нейкім калгасе, што стварыў там сабе сапраўдны рай і цяпер для яго нічога немагчымага не існуе.

— Так што прыязджайце да мяне ў калгас, — заключае ён. — Не пашкадуеце.

— Што-о-о? У калгас? — зноў заходзяцца ад смеху дзяўчаты. — Да гэтых трактарыстаў мурзатых? Што мы там з імі рабіць будзем? Навучаць верхавой яздзе? Ха-ха-ха...

Хлопец, збіраючыся ісці, яшчэ раз акідвае ненавісным позіркам сваіх суседзяў, з гідлівасцю заўважае, як лапае стары сваімі поўнымі і белымі, нібы вылепленымі з цеста, рукамі тонкі дзявочы стан.

— Гэй, студэнт, — чуе ўжо наўздагон, — адну хвілінку.

Азіраецца. Дзяўчынка спрытна адводзіць ад сябе руку «жаніха», лёгка, нібы матылёк, падлятае да яго. Не паспеўшы апамятацца, хлопец адчувае, як леглі на плячо яе мяккія пальчыкі.

— Мне надакучыў гэты стары, — быццам аднекуль здалёк, з іншага вымярэння, ловіць ён здзеклівы, з адценнем капрызу галасок і зусім блізкі смех. — Хачу быць з табою. Ты запросіш мяне ў рэстаран?

Такога павароту, відаць, не чакаў ніхто. Хлопец разгубіўся і маўчаў. Мужчыны аслупянелі.

— Што ты стаў як пень. Пайшлі адсюль. Я ж сказала, што з імі быць не хачу.

І яны выйшлі.

— І куды ж мы? — спытаў, абы не маўчаць, збянтэжаны юнак.

— Калі хочаш, пайшлі да цябе, — усё гэтак жа весела і бессаромна прапаноўвае спадарожніца.

— Гэта немагчыма.

— Тады пойдзем да мяне. Калі ты джэнтльмен, то не адмовішся правесці дзяўчыну дахаты. — Яна зазірае ў самую глыбіню яго вачэй, смяецца іскрыстым, задзірыстым смехам. — У тваіх вачах адбіваецца неба. Не, не адбіваецца — яны ўвабралі ў сябе цэлае неба. Такія глыбокія, чыстыя і светлыя.

Ён крывіць вусны недаверлівай, іранічнай усмешкай:

— Ты ўсім сваім хахалям так гаворыш? І гэтаму старому тое ж казала?

— Ага, казала, — ужо з нейкім раздражненнем парыруе яна.

Пасля гэтых слоў хлопцу падалося, што дзяўчына зусім не такая, якую строіла з сябе ў кафэ.

— Як ты вызначыла, што я студэнт?

— У цябе ж на ілбе напісана. А ведаеш, на каго ты падобны? — да дзяўчыны зноў вяртаецца весялосць. — На Морыса-мустангёра з фільма «Коннік без галавы». Памятаеш, у яго таксама былі прамыя і доўгія светлыя валасы, ён таксама быў высокі і стройны. Гэта мой любімы кінагерой. Я цябе таксама буду называць Морысам, добра?

— Заві. Але ў мяне няма мустангаў, — кідае ён з кропляй іроніі.

— А мне мустангі і не патрэбны.

— Жалезнага мустанга ў мяне таксама няма.

— Я ж, здаецца, сказала, што мне мустангі не патрэбны.

— Як жа тады мне цябе называць?

— Маё імя Валянціна. Так і называй.

— А маё — Жэнік.

Жытлом Валянціны аказаўся інтэрнат. Высокі, нібы слуп, абкладзены барвовай пліткай, ён узвышаўся над суседнімі будынкамі.

— Ты мне пазвоніш? — запыталася яна каля дзвярэй. І, не чакаючы адказу, прадыктавала нумар свайго рабочага тэлефона. — Гэта бальніца. Я там працую медсястрой, — дадала, амаль прытуліўшыся да вуха. Цмокнула яго ў шчаку і знікла. Быццам і не было. Толькі за дзвярыма гулка зацокалі абцасікі.

«Ну і гісторыя», — крутнуў галавою Жэнік і засмяяўся. Затым ён імчаў на аўтобусе да свайго студэнцкага інтэрната. Ужо змеркалася, і перад вачыма праляталі, быццам вялізныя снежкі, блакітна-белыя плямы ліхтароў. Сёння яны здаваліся асабліва яркімі, нават урачыстымі. Хацелася імчацца ўсю ноч, каб хоць крыху астудзіць узрушаныя, узбунтаваныя пачуцці.

* * *

На наступны дзень яны сядзелі ў маленькім рэстаранчыку за столікам ля самай эстрады. Жэнік упершыню наведаў такую ўстанову і адчуваў сябе не зусім ёмка. Але не толькі гэта было прычынай ніякаватасці. Усяго некалькі гадзін назад ён атрымаў ліст ад сваёй дзяўчыны з вёскі, поўны пяшчоты і нейкай, цяпер ужо, здавалася, наіўнай шчырасці. Хлопец глядзеў на багата сервіраваны стол, на ўсе гэтыя закускі, салаты, крышталёвыя шклянкі, бутэлькі; глядзеў на

асляпляльную, свежанькую Валянціну ў белай вязанай сукенцы, якая пакідала адкрытымі прыгожыя крамяныя плечы і частку грудзей. Ён бачыў перад сабою Валянціну, а сам успамінаў спатканні з Марыяй у дамоўленым месцы за ваколіцай. Божа, як адрозніваліся гэтыя сустрэчы — тыя, што былі ў вёсцы, і сённяшняя. Як не падобны адна на адну Марыя і Валя. Прыкладна так, як не могуць быць падобныя саматканая сялянская світка і модная імпартная кофтачка.

З Марыяй ён адчуваў сябе лёгка: мог сказаць што неўпапад — яна даравала, не баяўся быць наіўным, дзяліўся самым патаемным. Ёй таксама было лёгка з ім. Аднойчы яны аж да самага світання прастаялі, захутаныя шчыльным туманам, каля хаты, усё цалаваліся, мілаваліся, не маглі развітацца. А калі з-за сяліб прасачыліся першыя сонечныя промні, адкуль ні вазьміся — Марыіна маці і давай хвастаць дзяўчыну хвартухом па спіне. Здавалася, пасля такой знявагі яны не змогуць больш зірнуць адно аднаму ў вочы, але пры першай жа сустрэчы ён неяк па-простаму, па-сяброўску спытаў: «Што, дасталася ад маці?». «Дасталася, — гэтак жа проста адказала Марыя. — Але нічога, яна добрая. Толькі каля хаты ўсё роўна стаяць больш не будзем. Лепш за ваколіцай». І яны доўга і весела смяяліся, руйнуючы ўсялякую ніякаватасць.

...Тут жа трэба сачыць за кожным словам і рухам. Сабранасці патрабуе сама атмасфера іх яшчэ няпэўных, нявызначаных адносін. Добра, што за два гады вучобы крыху асвойтаўся ў горадзе, іначай даўно ўжо абняславіўся б. Валя — не Марыя. Ледзьве што — засмяе.

Пасля некалькіх чарак гарэлкі ніякаватасць прайшла. Марыя паціху знікала, адыходзіла на другі план, а вочы прагна лавілі Валю. Вось яна акуратна прабіла нешырокае кола танцораў, і яе зграбнае цела пачало вырабляць хуткія выкрутасы ў такт музыцы. Яркія кофтачкі, кароценькія спаднічкі, чорныя сетачкі калготаў, джынсы, касцюмы адразу ж расступіліся, прыпынілі рух, залюбаваліся невядомай танцоркай. Валя не ведала стомы. Яе рукі мільгалі то пад самай столлю, то плылі ў бакі, галава плаўна адкідвалася назад, цела выгіналался, нібы спружына. Жэніку захацелася раптам абняць яе, прытуліць да сябе, пацалаваць адкрытыя спакуслівыя плечы, злавіць гарачыя месячыкі вуснаў...

Да Валі пачалі падыходзіць мужчыны. Яна круціла галавою, гарэзліва смяялася, пасля крутнулася некалькі разоў з шырокаю джынсаваю курткаю, пакінула яе, падбегла да Жэніка... І яны сталі героямі вечара. У інстытуце ён навучыўся нядрэнна танцаваць, таму трымаўся з Валяй больш-менш упэўнена. Пасля па яе просьбе заказваў музыку, замяняў на эстрадзе гітарыста і нават не заўважыў,

як яны, яшчэ не астылыя ад гарэлкі, музыкі і танцаў, апынуліся на аўтобусным прыпынку, пасля ў інтэрнаце, у яе маленькім утульным пакойчыку.

Ноч ператварылася ў казку. Казкаю былі яе трапяткія рукі, якія аблытвалі цела мяккаю казытлівай павуцінкаю, яе хуткае, гарачае дыханне ў самае вуха; яно пранікала глыбока-глыбока ў сэрца, пераварочвала ўвесь свет, вымушала дзейнічаць... Казкаю быў яе дзівосны шэпт у цішы пакоя. Казкаю была яна, тоненькая, але не худая, налітая маладой свежасцю, загарэлая амаль да чарнаты, быццам адлітая з воску, са светлымі ўзгорачкамі палаючых грэшным, пякельным агнём грудзей, уся такая звабная і жаданая на белым прастакутніку канапы.

* * *

Наступны дзень быў такі ж цёплы, як і папярэднія. І людзі гэтак жа ўпарта і нястомна таўклі на вуліцы снежную кашу. Але ён гэтага не бачыў. Ён спаў спакойным, моцным мужчынскім сном на сваім ложку ў сваім інтэрнаце. На гэты раз яму не прыснілася нічога.

Недзе пасля абеду сон пачаў паступова адыходзіць, і думкі адразу ж перанеслі яго зноў у той утульны маленькі пакойчык з сінімі валошкамі ў нізкай тоўстай вазе на вялізным плакаце-календары. Яго ён заўважыў толькі пад раніцу.

«Зараз яна на працы... да паловы дзевятай, — успомніў, зірнуўшы на гадзіннік. — А так хочацца пабачыцца зноў».

Праз якую хвіліну Жэнік быў ужо ля тэлефона-аўтамата і накручваў прадыктаваныя Валяю лічбы.

— Я слухаю, — пачулася ў трубцы.

— Валя? Добры вечар. Гэта Морыс. Пазнала?

— Ага.

— Я пакінуў у цябе сваю куртку. Сёння зайду забяру.

— Заходзь.

— Ты будзеш мяне чакаць?

— ...

— Ало, Валя. Ты чуеш?

— Чую.

— Дык я зайду.

— Я ж кажу, заходзь.

«Які я наіўны, — думаў ён, кладучы трубку. — І пацягнула ж нешта за язык». «Чакаць будзеш?» — перадражніў сам сябе ледзь не ўголас.

Валянціна сустрэла яго ў сваім пакойчыку стрымана. «А няўжо ж на шыю кінецца. Гэта табе не Марыя, — зноў пакпіў ён сам з сябе.

— Хачу папіць з табою чаю, — прапанаваў першае, што прыйшло ў галаву. Толькі б затрымацца яшчэ хоць некалькі хвілін. Тыя мяккія, але моцныя павуціны, якімі яна аблытала яго яшчэ ноччу, скавалі не толькі цела, але і гонар, і Жэнік гатовы быў ужо на каленях маліць Валянціну, каб дазволіла застацца тут.

— Зараз падагрэю ваду. Але я піць не буду. Калі хочаш, магу зварыць каву.

— Не, лепей чай.

— Табе трэба не спазніцца на аўтобус. Тут далекавата дабірацца, — напомніла яна.

...Па дарозе дамоў ён думаў пра Валянціну ўжо са злосцю: «Вось я цябе і раскусіў, даражэнькая. Ты кахаеш за пачастунак. Табе нальеш, у рэстаран зводзіш — і каханне забяспечана. Не пачастуеш — бывай здароў. Як жа гэта ўсё прыкра. А яшчэ пытаецца, ці пазваню. Трэба ёй гэты званок...»

Але назаўтра ён пазваніў. І зноў Валянціна прымусіла аслупянець ад здзіўлення.

— Ты не крыўдуеш на мяне? — пыталася яна чароўным шэптам. — Прыходзь сёння. Я буду чакаць.

Пасля гэтых слоў хлопец гатовы быў хоць зараз з усіх ног імчаць да яе ў той маленькі ўтульны пакойчык з сінімі валошкамі на вялізным плакаце-календары.

* * *

Усе мы залежныя ад волі нашага ўладара — усемагутнага Лёсу, добрага і бязлітаснага ў адначассе. У яго свае правілы, свае ўмовы гульні, якімі ён ніколі і ні з кім не дзеліцца. Усё вырашае сам — Бог і д'ябал у адной асобе. Некалькі дзён назад ён захацеў злучыць, звязаць у адзін вузел дзве нітачкі чалавечых жыццяў і зрабіў гэта самым нечаканым, нейкім не зусім нават натуральным чынам. Жэнік адчуваў, што калі яму і не выпадзе сустрэцца больш з Валяй, дык вузел гэты ўсё роўна доўга-доўга будзе тлець у яго сэрцы пякучым вугольчыкам. Зараз жа Лёс захацеў, каб тае прагна чаканай сустрэчы не адбылося, і вось ужо юнак імчыць у цягніку дамоў, туды, дзе яго чакаюць бацькі і сціплая вясковая дзяўчына Марыя.

«Дома нешта здарылася, гэта бясспрэчна, — трывожныя думкі заглушалі грукат цяжкіх жалезных колаў цягніка, нацягвалі кожную мышцу яго маладога здаровага цела, вымушалі іх напружана

дрыжаць, як пры цяжкай рабоце. — Але што, што магло здарыцца? Чаму такі скупы на словы быў гэты ліст ад Марыі? У ім нічога не растлумачана. Можа... самае горшае? Не. Тэлеграма была б».

На процілеглай лаўцы сядзела немаладая вясковая кабета ў ярка размаляванай хустцы, ела вараныя яйкі і хлеб. Затым бялявая ружовашчокая правадніца прынесла чай, і жанчына пачала сваімі непаслухмянымі, пакрыўленымі і патрэсканымі пальцамі развязваць зашмальцаваную насоўку, у якой ляжалі некалькі пяцірублёвак і адна дзесяцірублёвая паперка. Капеек не было.

Рукою, падобнаю больш на сухую альховую галінку, жанчына працягнула правадніцы грошы. Зрабіла яна гэта да таго няўпэўнена, нават з непрыхаваным страхам, быццам апраўдвалася, што ў яе не знайшлося капеек.

— У мяне няма здачы, — наганяючы на жанчыну яшчэ больш страху, адрэзала правадніца. — Калі размяняеце сваю пяцёрку, тады і прыйдзеце па чай.

І правадніца падхапіла са стала ахутаную парай шклянку ў металічнай падстаўцы.

— Хвілінačку, — спыніў яе раптам Жэнік. — Вось вам капейкі. Стаўце чай на стол.

Ён сам выхапіў з пухленькіх дагледжаных рук гарачае пітво, паставіў перад жанчынай.

— Дай Бог табе здароўя, сыночак, — толькі і прагаварыла тая, абдымаючы, быццам нейкую вельмі каштоўную рэч, звычайную шклянку, напоўненую духмяным напіткам.

— Х-хэ, рыцар знайшоўся, — ацаніла яго ўчынак правадніца і знікла за дзвярыма.

Жанчына дрыготкімі рукамі разгарнула паперку, узяла дзве тоненькія белыя цаглінкі... У шклянцы жвавай сінічкай заціўкала бліскучая лыжачка.

У яго маці такія ж патрэсканыя, грубыя, абветраныя рукі. Праўда, грубыя яны толькі з выгляду, а на самой справе вельмі пяшчотныя і мяккія — гэта хлопец добра памятае яшчэ з дзяцінства.

У Валі таксама пяшчотныя рукі. Але іх пяшчота зусім іншая — узбуджае, дурманіць, падбівае да неабдуманых дзеянняў. Рукі ж маці супакойваюць, наганяюць здаровы і моцны сон, лечаць ад усялякіх стрэсаў, душэўнага прыгнечання, перажыванняў.

Дотык Марыіных рук ён чамусьці ўжо не памятае. Ды і вабіла ў ёй Жэніка нешта зусім іншае. А што, ён і сам дакладна не ведаў: ці то ўнутраная нейкая прыгажосць, ці шчырая, з ямачкамі на шчоках, усмешка, ці жывыя і бойкія, з затоенай недзе ў глыбіні дзікаватасцю

чорныя выразныя вочы. Хутчэй за ўсё, вабілі ўсе яе вартасці, узятыя разам.

Жэнік раптам акінуў адным усеабдымным успамінам сваё жыццё, пачынаючы аж з таго далёкага часу, які ён толькі мог узнавіць у памяці. І хаця жыццё было пакуль што вельмі і вельмі кароткае — нядаўна размяняў трэці дзесятак, — ён склаў з яго па нейкай сваёй, нікому не вядомай схеме цэлы горад — горад успамінаў. Шчаслівыя выпадкі набывалі ў ім формы раскошных палацаў і шырокіх праспектаў, няшчасныя або нежаданыя з'явы нагадвалі маленькія, увагнаныя па вокны ў зямлю хаткі, якія даўно патрабуюць злому, хвіліны смутку юнак абазначаў вуліцамі без асфальту, на якіх заўсёды вільготна і няўтульна... Вось так і атрымліваўся ў Жэніка цэлы горад, вельмі падобны на сапраўдныя гарады, якія ён паспеў убачыць.

Цяжкія колы цягніка грукаюць манатонна, быццам адбіваюць мелодыю, а хлопец у вагоне, закалыханы ёю, блукае і блукае па няўтульных вуліцах свайго асабістага гарадка, час ад часу зазірае ў маленькія скасабочаныя хаткі: у адной з іх маці плача над памёрлай бабуляй, у другой ляжыць цяжка хворы бацька і просіць пасядзець з ім. «Няўжо ў маім горадзе прыбавіцца яшчэ адна такая чорная хаціна? — думае хлопец. — Нашто яны ў горадзе? Няхай бы ўсё было добра». Раптам брудная вузкая вулачка выводзіць яго на новы светлы праспект, высланы рознакаляровым зіхатлівым брукам, які ўпіраецца ў велічны палац; такой прыгажосці ў сваім горадзе юнак яшчэ не бачыў ніколі. Ахоплены цікаўнасцю, ён адчыняе запаветныя дзверы і... нечакана трапляе ў абдымкі Валянціны. Яе лёгкія, быццам крылы матылька, рукі песцяць ягоныя шыю і твар, дрыготкія вусны слізгаюць полымем па яго вуснах. Залаціста-зялёныя вочы яе на залацістым твары і пад залатою кудзеляю валасоў сабралі ў сабе, здаецца, усе знічкі, якія толькі ёсць на небе. Яны блішчаць і іскрацца. Іскрыцца і ўвесь пакой у палацы. Здаецца, усё тут выраблена з золата.

«Чаму я ні разу не наведаў палац, у якім жыве Марыя? — спытаў ён у самога сябе перад тым, як заснуць, а можа, нават і ў сне.

* * *

Пад цёплымі промнямі чыстага вясенняга сонца цямнее, плавіцца снег на палях. Ноччу ён падмярзае, пакрываецца зверху нетрывалым шурпатым панцырам, а днём зноў слязіцца, яшчэ больш асядае, прыпадае да чарназёму, робіцца порыстым, нібы гумавая мачалка. Пасля поры растуць, выядаюць апошнія снежна-ледзяныя крышталікі, і сон-

цу адкрываюцца бліскучыя чорныя камячкі зямлі. У некаторых месцах глеба набрыняла, і вада, не маючы куды дзецца, застойваецца на паверхні, утвараючы невялікія лужыны.

На прысядзібным участку Андрэя Галубка лужын не бывае ніколі. Ён не дае ім застойвацца. Своечасова адводзіць раўчукі (адзін паміж полем і мяжой, астатнія — у залежнасці ад нізкіх месцаў), па якіх цёмная, змяшаная з брудам вада сцякае ў невялічкі штучны вадаём, выкапаны Галубком яшчэ ў тыя далёкія часы, калі ён працаваў на калгасным экскаватары.

Зараз ён чысціць ад усялякага бруду — камякоў зямлі, ламачча, шэрых каменьчыкаў — тоненькія водныя шляхі, падганяе рыдлёўкаю ваду, спявае мала каму вядомую сёння, але яшчэ не забытую песню.

Жэнік непрыкметна падыходзіць да плота, убірае ў сябе да болю знаёмыя голас і словвы:

— Каліна-маліна, чаму не зацвітанеш?
Ці спёкі баішся, ці дажджу жадаеш?
— Спёкі не баюся, дажджу не жадаю.
Як цвісці мне ў маі, стаю дый гадаю.
Зацвіла б я белым, дык усе людзі знаюць.
Зацвіла б чырвоным – з голлем паламаюць

Бацька заганяе рыдлёўку ў неадталую яшчэ зямлю, і на вяршок адпаліраванага дзяржальна апускаецца яго шырокая цяжкая пяцярня з набрынялымі карэнішчамі венаў. Бацька засяроджана назірае, як збягае па раўчуку ўчарашні снег, як спяшаюцца ў вялікую ваду маленькія крохкія льдзінкі, якія нават тут дахітраюцца налазіць адна на адну, крышацца на яшчэ больш дробныя часткі, імітуючы сапраўдны рачны крыгаход.

— Дзень добры, тата, — вітаецца сын.

— Здароў сынок, здароў, — не хаваючы радасці, адказвае, павярнуўшыся, бацька. — Ты што, на канікулы?

— Якія зараз канікулы, тата.

— А як жа ты прыехаў? З заняткаў уцёк?

— Чаму ўцёк. Адпрасіўся. Марыя напісала, каб тэрмінова прыехаў дахаты. Я падумаў — нешта здарылася. А што, усё нармальна тут?

— Марыя напісала? — Жэніку падалося, што бацька вельмі здзівіўся. Ну, можа, і малайчына, што напісала. Хоць дома пабудзеш.

— Дык у вас праўда ўсё добра?

— Бяды вялікай няма. А Марыя, відаць, напісала табе пасля таго, як маму нашу дзверы ў старым кароўніку прываліілі. Там крукі жалезныя лёдам абраслі, петлі на іх падняліся, і маці толькі кранула дзверы, каб адчыніць, а яны прама на яе і паваліліся. Так што і

галаве, і спіне, і паясніцы, нават левай руцэ дасталося. Ледзьве дамоў прывалаклася. А зараз то нудзіць яе, то бок абмірае.

— Так моцна стукнула?

— А што ж ты думаў. Ведаеш, якія там дзверы — вялізныя, цяжкія. Яны нават не стукнулі — прывалілі яе. Але і гэтага хапіла.

— У бальніцы была?

— А як жа. Бальнічны далі... на тры дні. Сказалі, як будзе горш, каб прыязджала, прадоўжаць. Але яна не хоча ехаць. Там, кажа, пакуль дачакаешся сваёй чаргі — памерці можна. Лепей ужо на працу хадзіць.

— І што, ходзіць?

— А куды дзецца? Бальнічны ж калі ўжо кончыўся.

— Кепска ёй, мусіць, пакалечанай, працаваць?

— А няўжо ж добра. Прыйдзе з фермы — і ў ложак адразу.

— Няхай бы хоць з калгасным начальствам пагаварыла, каб адпусцілі на які тыдзень-два. Жывыя ж людзі, павінны зразумець.

— Ага, чакай — кінуць яны табе ўсё і пачнуць разумець нейкую там замурзаную даярку. Яны ж цяпер злыя на маму.

— За што гэта?

— Прасілі, каб сказала ў дзяржстраху, што траўму не на працы атрымала. Ім жа за гэта нібыта вельмі дастаецца ад начальства. А яна не паслухалася. Крыўдна, што гэтулькі дармаедаў сядзіць у канторы, і ніхто ні пра што не дбае. Дый страхоўка большая будзе.

Бацька падняў рыдлёўку, падзёўбаў ёю мокры чарназём, зноў увагнаў у зямлю і заключыў, нібы прачытаў прысуд:

— Цяпер у начальнікаў справядлівасці не даб'ешся.

Маці ляжала на канапе ў зале. Не спала, таму сына заўважыла адразу.

— Помніш? — сказала, калі Жэнік прысеў побач, — ты некалі хацеў стаць трактарыстам, як бацька. Добра, што адгаварылі цябе...

Маці, здавалася, гаварыла больш самой сабе, чым Жэніку. Але адтаго, што сын слухае яе, рабілася лягчэй на душы...

Хлопец на якую хвіліну нібы разгубіўся. Слізгаў позіркам то па вялізных зімовых яблыках на стале, ад аднаго паху якіх сціскала зубы аскома, то разглядаў дарожкі на падлозе. Там-сям на іх падсыхалі камячкі чорнай зямлі — трэба было б вынесці іх на вуліцу, павыбіваць. Вялізнае лісце фікусаў пакрылася сівізною — таксама ніхто іх даўно не даглядаў. Праўда, утульнасць яшчэ цяплілася ў хаце, але яе прыкметна паменшала. З хваробай гаспадыні ў заняпад прыходзіць не тое што хата, але і ўся гаспадарка — гэта даўно прыкмечана людзьмі.

Жэнік раптам адчуў, што матчына крыўда перакінулася і на яго. Вось яна ўжо распірае грудзі, бліскае з вачэй нядобрым помслівым агеньчыкам, сціскае ў кулакі пальцы.

Ён ускідваецца з лаўкі, кіруецца да дзвярэй, азіраецца на трывожнае матчына «Ты куды, сынок?», прыкмячае адначасова, як з іконы ў процілеглым кутку на яго з папрокам пазірае Хрыстос і быццам памахвае даўгімі перакрыжаванымі сярэднім і ўказальным пальцамі. Жэнік супакойвае маці кароткім «Зараз вярнуся» і шумна выбягае на парог...

* * *

Вечар неўпрыкмет накрывае хлопцаў празрыстым чорным вэлюмам, і яны, адгароджаныя ад чужога вока цёмнаю сцяною, смялеюць, гавораць усё гучней і гучней, ужо не хаваюць пляшку за ствалом маладой разгалістай таполі, у кроне якой няўклюдна варочаецца выпэцканая ў сажу вата нізкіх, набрынялых веснавой вільгаццю хмар.

У кампаніі лепшых сяброў Жэнік пачувае сябе ўтульна. Блакітнае неонавае святло тоўстым пучком вылятае з акна вясковай сталоўкі-забягалаўкі, насупраць якой і размясціліся хлопцы. Па правую руку ад Жэніка сядзяць браты Сяргей ды Віктар. Побач хістаецца даўгі, як хлыст, кудлаты тамада з пляшкаю і шклянкай у руцэ. Яго таксама завуць Віктар. Але хлопцы вымаўляюцьь гэтае імя адмыслова — націскаючы на апошні склад. У іх атрымліваецца — Вікт'ор.

Стограмоўка пераходзіць у Жэнікавыя рукі.

— Вось што, хлопцы, ніяк не магу забыцца на матку. Яе ж гэтак зняважылі. Хочацца помсціць. Не магу дараваць, далібог, не магу...

— Можна цёмную зрабіць, — прапаноўвае Віктор.

— Здагадаецца, — папярэджвае Сяргей.

— Няхай здагадваецца. Доказаў жа ў яго не будзе, — стаіць на сваім Віктор. — Ці ты мо пра другое думаеш — пра Марыю? Дык мы з гэтым смаркачом Славікам можам пагаварыць. Ён і дарогу да яе забудзе.

Твар Жэніка раптам асвятляе ўсмешка.

— А ведаеце, як назвала мяне адна цудоўная дзяўчына ў Менску? — пытаецца ён. — Не ведаеце? Морысам. Мне спадабалася гэтая мянушка.

— А што, і праўда — падобны...

— Я хачу выпіць за тую дзяўчыну, за Валю.

— Давай, Жэнік.

Хлопец пакутліва глытае горкі напой, але выпівае да дна.

У гэты час светлы праём акна засланяе нешта вялізнае і цяжкае. Аж чутно, як пішчыць і чаўкае пад нагамі раскіслая ад вады зямля. Хлопцы апынаюцца ў цемры.

— Хто там яшчэ засціць? — незадаволена бурчыць Сяргей.

— Цішэй, гэта ж Міхаіл Васільевіч, калгасны старшыня, — хутка пазнае чалавека Гена. — Зноў напіўся ў сталовай.

— Стойце тут, хлопцы. Я зараз вярнуся, — вочы Жэніка ўспыхваюць рашучасцю і нейкай звярынай, задубелай злосцю.

— Мы з табою. Паможам, калі што, — схапіў яго за рукаў Сяргей.

— Не, я сам.

Старшыня, мусіць, не пазнаваў юнака. Ён доўга ўзіраўся: хто гэта такі перагарадзіў дарогу ды яшчэ быццам бы і пагражае? А пазнаўшы, закрычаў гнеўна, як і належыць сапраўднаму гаспадару:

— Ты... Ты пагражаць мне? Ану, марш адсюль. Блытаецца тут пад нагамі ўсялякая драбядзень.

Апошняе яго слова злілося з хуткім — знізу ўверх — ударам.

Праціўнік калыхнуўся. З яго грудзей вырваліся раз'юшаныя праклёны. Тоўстыя бярвенні рук пацягнуліся наперад.

— Задаўлю... г-гада, — шыпеў старшыня.

— Рукі кароткія, — адказаў яму Жэнік, і яго моцны, да болю сціснуты кулак прачарціў той жа шлях, як і хвіліну назад.

Масіўная фігура праціўніка калыхнулася яшчэ раз і пачала бездапаможна падаць на хлопца. Жэнік падхапіў яе і пацягнуў туды, дзе сушэй, — на агністую грыву леташняй травы.

— Заўтра чакай бяды, — сказаў яму па дарозе дамоў Сяргей. — Я ўжо ведаю, што бывае пасля такога разбою.

— Ты не можаш сабе ўявіць, як лёгка мне зараз. Адпомсціў, і быццам нарадзіўся нанова. Ніколі не думаў, што помста валодае такой моцнай лекавай сілай. А пра якую бяду ты гаворыш?

— Павесткі з міліцыі чакай. Пасадзіць могуць. Старшыня ўсё-такі.

Словы сябрука выбілі апошні хмель з галавы. Заснуць у гэтую ноч Жэнік так і не змог. Трывожыўся не за сябе — за бацькоў. Такога ўчынку яны ніяк не чакалі ад свайго адзінага, любімага сына.

* * *

Пакой, у якім апынуўся Жэнік праз некалькі дзён пасля той кароткай п'янай бойкі, у міліцыі называюць «тэлевізарам». Чаму «тэлевізарам»? Мабыць, таму, што ён мае шкляныя дзверы, праз якія можна бачыць усё, што за імі робіцца. Да таго ж, размешчаны яны насупраць другіх дзвярэй, за якімі сядзіць дзяжурны міліцыянер. Па-

колькі дзверы «дзяжуркі» амаль заўсёды адчынены, то атрымліваецца, што чалавек у «тэлевізары» знаходзіцца пад пастаянным наглядам. Як рыба ў акварыуме.

Жэнік сядзіць на лаўцы пануры, знябожаны. Чакае выкліку. Правая рука яго з ababітымі пальцамі падпірае моцны, як вытачаны з каменю, падбародак. Вузкія і доўгія каласкі броваў маўкліва сышліся на пераноссі, па якім зверху ўніз пралеглі дзве глыбокія тужлівыя складкі. Выразныя вільготныя вочы, быццам дзве валошкі ў час дажджу, глядзяць некуды ўдалячынь праз тоўшчу шэрай бетоннай падлогі.

«Чаму бацькі ні разу не папракнулі мяне за той неразумны хуліганскі выбрык?» Сярод усіх пытанняў, якія мучаць яго цяпер, гэтае займае цэнтральнае месца. Часам яго засцяць іншыя пытанні, і яны таксама здаюцца галоўнымі.

«Навошта я званіў Валі? Што я гаварыў ёй? Гаварыў, што мне блага. Як жа гэта нізка, не па-мужчынску. Раскіс. Па падтрымку адразу кінуўся. Добра, што не паспеў нагаварыць многа — сувязь перапынілася. Далібог, апаратура айчынная... Валя, здаецца, нават не паспела нічога адказаць. А можа, і не хацела адказваць. Можа, забылася ўжо». Ад гэтай здагадкі сэрца сціскаецца ў маленькі цвёрды каменьчык і ные нудна, аж захлёбваецца, быццам увабраўшы ў сябе тысячы чалавечых боляў. Пакуты абвастрыліся яшчэ больш, калі хлопец уявіў сабе, як высмейвае Валя яго наіўнасць перад сваімі новымі жаніхамі.

«Цікава, як будуць выглядацьь гэтыя дні ў маім горадзе ўспамінаў праз некалькі гадоў». Ён спрабуе пафантазіраваць, але нічога не атрымліваецца. Перад вачыма ўзнікае вобраз маці — патухлыя вочы, пацямнелыя маршчыны, згорбленае цела і нейкая зацятая, прыдушаная маўклівасць. Тут жа прыйшло на памяць, як Сяргей пры сустрэчы паведаміў, што ён, Жэнік, не столькі нашкодзіў, колькі дапамог старшыні. У таго, аказваецца, вельмі балеў зуб, і якраз яго хлопец выбіў пры першым жа ўдары.

«Чорт, гэтаму гаду нават лупцоўка на карысць ідзе». Ад такіх думак маршчыны на пераноссі робяцца глыбейшымі, а бровы сыходзяцца шчыльней і ніжэй навісаюць над цёмнымі валошкамі вачэй.

«Пачытаю, што нефармалы пішуць. Кажуць, у іх больш праўды», — успамінае пра даўнюю пакупку, дастае з кішэні газету. Але раптоўны стук блытае думкі, змушае падняць галаву.

У расчыненых дзвярах паяўляецца грузная, распаўнелая постаць міліцыянера.

— Прымі дзяўчыну, хлопец. Толькі ненадоўга, начальнік убачыць — бяда будзе, — прабасілі яго тоўстыя добрыя губы, і ў пакой лёгкаю, асцярожнаю хадой увайшла... Не, не ўвайшла — выткалася з паветра (Божа, хто б мог падумаць) яго Валянціна. Здаецца, сама прыгажосць запоўніла залацістым святлом гэты маленькі халодны пакойчык.

Жэнік ускоквае, імкнецца рушыць насустрач і... не мае сіл. Ногі змярцвелі, нібы ўраслі ў бетонную тоўшчу падлогі.

— А вось і я, — гаворыць яна лёгка і проста, быццам прыезд гэты быў даўно запраграмаваны, і апякае яго рукі сваімі — мяккімі і пяшчотнымі. — Што ў цябе тут здарылася? Ты мне так і не паспеў усё сказаць па тэлефоне.

Ён песціць вачамі яе прыгожы, смуглявы твар і не знаходзіць што сказаць.

— Валя, я ўсё забываў у цябе спытаць, дзе ты так загарэла. Ты што, на курортах была? — гэтае пытанне аказалася нечаканым нават для яго. Адкуль яно толькі ўзялося?

Дзяўчына смяецца звонка, залівіста, асвятляючы шэры пакой белізною роўных, выстраеных па ранжыру зубоў.

— Які ты смешны і слаўны, мой легендарны Морыс, — звініць тысячамі малюсенькіх званочкаў яе залівісты голас. — Я загарэла пад кварцавай лямпаю. Знарок, каб быць прыгажэйшай, смуглявай. Праўда, папрыгажэла? Хаця зараз гэта не мае аніякага значэння. Галоўнае, што мы зноў разам. І я не паеду адсюль, пакуль не даведаюся, што чакае цябе наперадзе. Я ніколі не пакіну цябе, мой добры і мужны хуліган. Ты хочаш, каб я была з табою?

Яшчэ ніколі не білася так гулка яго маладое чулае сэрца, яшчэ ніколі не адчуваў ён сябе так упэўнена, як зараз, яшчэ ніколі не быў ён такі шчаслівы...

Плюшавае сабачаня

На бліскучай паліцы маленькай вясковай крамы разам з іншымі цацкамі стаяла плюшавае сабачаня. Самае звычайнае: жоўтае з чорным носікам і чорнымі вочкамі-гузікамі. Звычайнае, бо не ведала яшчэ, што яму наканавана прынесці няшчасце сваім будучым гаспадарам. Хаця, калі папраўдзе, то нельга ўпэўнена сказаць, няшчасце гэта будзе ці, наадварот, шчасце. Ды пра канчатковы вынік вам ніхто і не скажа, няма дурных падагульняць тое, што будзе выкладзена наперадзе. Які ж тады сэнс пісаць апавяданне?

* * *

Дык вось. У той самы час, калі сабачаня нават і не думала аб сваім прызначэнні ў жыцці, у краму ўпырхнула пярэстая сукеначка.

— Вой, Рэгіначка, добры дзень, — ветліва заўсміхаліся на яе прывітанне прадаўшчыцы, якіх тут было дзве: рабая Годэліха, як заўсёды цяжарная, і высокая маладая Ніна Шулякова. Яны ведаюць: Рэгіна ніколі не пакіне краму з пустымі рукамі.

— Дзевачкі, можа, вам калі калготкі падкінуць... чорныя...

— Што ў сетачку?

— Ды ну, у сетачку ў крамах не прадаюць. Хоць бы просценькія. Пакіньце мне парачку, ага? Вой, якая модная кофтачка. Шыфонавая, мусіць. Колькі яна?

— Сорак, па-мойму. Зірні там на этыкетку.

— Ого, з падплечнікамі. Точна — сорак. — Рэгіна адпусціла каляровую паперку, і тая загайдалася на тонкай нітачцы. — А што яшчэ ў вас новага?

— Хто яго ведае. Вунь — сабачка хіба. — Рухавая Ніна кіўнула ў бок маленькага жоўтага шчанюка і зусім абыякава ўсміхнулася.

— Ах ты мой мардаценькі. Ну, ідзі да мяне, ідзі мой малюсенькі.

І цацка апынулася ў руках задаволенай Рэгіны. Сабачаня было вельмі прыгожанькае і смешнае, а яго тоўсценькі і задраны ўверх хвосцік так і намерваўся гайданущца ад асалоды на мяккай ружовай далоні маладзіцы.

— Колькі ён?

— Паўтара...

— Бяру. Наце вось, рубель... Так, так, дваццаць, сорак. Ага, ёсць пяцьдзесят...

Хутка шчанюк апынуўся на новенькім паліраваным трыльяжы сваёй няўрымслівай гаспадыні, а пад нагамі ў яго ляжала

накрухмаленая карункавая подсцілка. Калі б сабачаня было жывое і магло павярнуць галаву да люстэрка, то яно, пэўна, убачыла б падобную да сябе істоту. Але шчанюк, на жаль, быў плюшавы і не мог бачыць не толькі сябе, але і тоненькую расчырванелую Рэгіну, якая сядзела насупраць, глядзела ў яго гузікавыя вочкі і ціхенька смяялася. Не бачыў ён і зіхатліва-белых пацерак яе раўнюткіх зубоў, доўгіх ільняных валасоў. Не бачыў яе выспеленага зграбнага цела, калі яна, зусім голая, любавалася сабою тут жа, перад ім, у вялікім люстэрку трэльяжа.

Ён — шчанюк, усяго толькі цацка. А таму нават не ўздрыгануўся, калі дзверы неспадзявана рыпнулі і з сенцаў данеслася глухаватае тупанне.

Рэгіна спрытненька кінулася да свайго падшыванага халаціка, падкінула яго над сабою, трапіла па-дзіцячы маленькімі ручанятамі ў мяккія праёмы рукавоў і...

...У дзвярах вырасла нязграбная постаць мужа. Ён смяяўся:

— Ага, злавіў.

— Адвярніся, бессаромнік. — Яе пальчыкі дробненька танцавалі на гузіках.

— Ну, што ты, на самай справе. Муж я табе ці не? Колькі ўжо хавацца можна?

— Хіба мы не спім разам голыя?

— Спім... але... — ён не знайшоўся што сказаць, змоўк.

— Што ў цябе ў сумцы?

— Кнігі.

— Колькі табе іх трэба? Гэта вялікія грошы, Раман.

— Ты вялікія грошы выкідваеш на свае анучы.

— Я хачу прыгожа апранацца. Мне яшчэ няма дваццаці. Вопратка неабходна кожнаму чалавеку, а вось кнігі... кнігі... Кніжка цябе не ўпрыгожыць.

— Упрыгожыць... унутрана.

— Лухта ўсё. Такія казкі я чула яшчэ ў дзяцінстве. Паказвай, што там.

Раман хуценька чыркнуў замочкам па пластмасаваму чарвяку «маланкі», і перад вачамі Рэгіны паявіліся чатыры рудыя томікі Васіля Быкава.

— Ну й колер. Куды іх цяпер? У сценку я такую дрэнь не пастаўлю, увесь выгляд папсуе.

— Што ты вярзеш. Ты проста не чытала Быкава. Ён святы для беларусаў. Яго чытае ўвесь свет.

— То няхай і пераплёт робяць адпаведны.

— Не хвалюйся, і прыгожа пераплятаюць. Толькі яны такім «эстэтам», як ты, дастаюцца.

— А такія дурні, як ты, падбіраюць тое, што ніхто не бярэ.

— Змоўкні.

— С-санітары кніжных крамаў. — Тоненькі месячык яе вуснаў скептычна скрывіўся.

— Рэгіна, мне здаецца... Ты не заўважаеш, як нацягнулася нітачка нашых адносін? Што будзе далей? Я ўжо не памятаю, калі мы з табою ў апошні раз нармальна, без папрокаў, гаварылі.

— Начытаўся, бедненькі: «...нітачка адно-о-осін». Мы жывём без года тыдзень, а ты гаворыш так, быццам прайшло жыццё.

— Кожнае імгненне — жыццё.

— У-у-у, куды загнуў. Паглядзі, у цябе сцёрся каўнер.

— Што з таго. Галоўнае, каб не сцёрлася душа.

— Ты пораш гарачку.

— Ты проста не разумееш унутранай прыгажосці. Ты не ўмееш бачыць яе.

— Я бачу прыгажосць, якую не трэба выдумляць. Паглядзі, якое слаўнае сабачаня. — Рэгіна весела падхапіла маленькі жаўтаваты камячок, падняла над сабою на сваёй маленькай ружовай далоньцы. Зазвінеў яе мілы сярэбраны смех.

— Ты купіла сабачку?

— Ага. Ён такі прыгожы і смешны.

— Ты стала купляць зусім непатрэбныя рэчы.

— Табе не падабаецца?

— Я перастаў разумець цябе. Гэта ж страшна. Чаму ты так безадказна раскідваешся грашыма? З-за цябе нам заўсёды не хапае на самае неабходнае.

— Я так хачу. — Смех гарэзліва падскочыў да хрустальнага свяцільніка, звонка з'ехаў па праменьыку на трыльяж, акунуўся ў маленькую вазачку з палявымі рамонкамі і, раптам ператварыўшыся ў кропельку яду, расцёкся па зусім бездапаможным сэрцы юнака. «Я не магу так», — застагнала яно.

Сабачаня раптам пераскочыла ў Раманавы рукі і праз які момант шмякнулася, нібы гумавы мяч, у куток і адскочыла на дыванок. За Раманам гулка грымнулі дзверы.

— Ну вось, — Рэгіна разгублена схілілася над цацкай. — А ўсё ты вінаваты, барбос.

І зноў такі, калі б шчанюк быў жывы, ён бы падумаў ці нават сказаў бы: «Я згладжваю сваю віну ўжо тым, што глытаю твае слёзы». Плюш сапраўды вельмі добра ўсмоктваў гарачыя салёныя кропелькі.

* * *

— Божа, без яе я зусім не магу. — Раман крыкнуў так гучна, што некалькі чорных прахожых пад чорнымі парасонамі павярнулі да яго белыя твары і недаўменна зальшпалі вачыма. Разумеў яго зараз хіба што дождж. Гэта яму крычаў Раман. Ён любіў гэты гаючы шум, доўгія срэбныя нітачкі, што выцягвае зямля з чорнай кудзелі-хмары сваімі мітуслівымі бурбалкамі. У такі час наваколле нагадвае яму карціну. Лес, хаты, хлявы, асобныя дрэвы, клуб — усё на нейкі час мярцвее, і толькі дождж разразае гэтае велічнае, выкананае цёмнымі фарбамі, палатно.

Гэта ён, заўсёды спакойны і верны сябар і дарадца — дождж, упарта нёс Рамана на маленькі вясковы прыпынак. І чалавек цалкам даверыўся гэтай патаемнай прыроднай сіле.

«Цудоўна, цудоўна», — шэпча шалёная залева, закалыхвае, аглушае, дурманіць. І ўжо не чутно, як буйныя кроплі закрадваюцца за каўнер, расцякаюцца па скуры, грэюцца на згорбленай спіне.

Ён не думаў цяпер, колькі дажджавых нітак аддзяляе яго ад Рэгіны. Злічыць такое — чалавеку не падуладна. Ён ведаў іншае: прайшоў тыдзень — сем дзён. Не кароткіх шчаслівых дзён, а доўгіх, як само жыццё, як гэтыя халодныя крэсы дажджу, што злучаюць сабою неба і зямлю.

— Дождж, не пакідай мяне. Вядзі, вядзі мяне да яе... — Не ведаю, сказаў ён гэта ці проста падумаў. Урэшце, ён сам гэтага не ведаў. Але дождж пачуў. Гэта так слаўна.

Ён не пакідаў Рамана ў дарозе. Ляскатаў па даху аўтобуса, біўся аб шкло і бездапаможна сцякаў уніз; вышукваў невялічкія адтуліны, прасочваўся ўнутр, пракладваў аж да карычневага лінолеуму падлогі светлыя раўчукі на запыленай, а некалі бліскучай абіўцы.

Няўлоўна мігцяць далёкія і блізкія агні. Часам яны выцягваюцца ў доўгія бляклыя крэсы, перакрыжоўваюцца з лініямі дажджу, знікаюць... паяўляюцца зноў...

Цёпла, утульна, неспакойна...

Непадалёку ад хаты дождж сцішэў. А можа, яго тут не было зусім. Можа, тут не было суму?

— Дождж, ты прывёў мяне сюды, каб пакінуць каля самай мэты аднаго? — Раманавы рукі стомлена апусціліся на слізкія поручні мастка.

У бруднай канаве, на самым дне гнілога сметніка, злосна скавытаў прамокшы да ніткі вецер. Раман абыякава назіраў, як

шалёна рваў ён з бліскучай кансервавай бляшанкі вузенькую палосачку паперы, перакульваў жоўтыя абрыўкі газет, гайдаў некалі ружовую бязногую ляльку, жудасна завываў у тоненькім рыльцы пляскатай бутэлькі з-пад адэкалону, забаўляўся, як футбаліст з мячом, з маленькім жаўтлявым клубочкам, падобным да...

— Яе сабачаня, — узрадавана падумаў Раман і збег уніз.

— Добра, што я знайшоў цябе. Але якое ты бруднае, мокрае. Нічога, я цябе выкручу і сагрэю каля свайго сэрца. Гэта гаспадыня выкінула цябе на сметнік, так? І колькі ж ты тут праляжала? Я занясу цябе на тваё старое месца, і ніхто больш не пакрыўдзіць цябе. Ты дапамог мне, ты, барбос. — Раман пстрыкнуў сабачаня па чорнай кнопачцы носіка і шчыра, упершыню за сем дзён, засмяяўся.

Шчанюк быў плюшавы і не чуў, як у грудзях, да якіх ён быў шчыльна прытулены Раманаваю рукою, горача калацілася ўзрушанае ЯЕ блізкасцю сэрца. А тым больш не чуў ён біцця яшчэ аднаго змучанага трывогаю і чаканнем сэрца. Ён не ведаў нават, хто вінаваты ў яго нядаўніх пакутах, як, зрэшты, не ведаў, ці пакутаваў ён увогуле.

У цягніку

Са мною ў цягніку ехалі двое — Цягун Толік і Касцюк Васіль. Яны мне ніякія не сябрукі. Так — знаёмыя. Толіка, праўда, ведаю даўно, яшчэ са школы. Ён мяне ў камсамол прымаў. Памятаю, у тых, хто ўжо атрымаў чырвоную кніжачку, я пытаўся: «Хто прымае? Што за чалавек такі?» І чуў у адказ: «Ды Цягун нейкі. Ачкарык. Даўжэзны такі і худы, што саломінка. А па статуце ганяе, па ордэнах, па з'ездах, ажно пакуль з цябе халодны пот не пырсне». Я тады здзіўляўся сваёй празорлівасці: якраз такім, доўгім і ў акулярах, я і ўявіў яго адразу, як толькі пачуў прозвішча Цягун. Бывае ж такое, калі прозвішча падказвае, які выгляд мае яго носьбіт.

Нягледзячы на свае выключныя акуратнасць і прынцыповасць, ён усё ж не ўзняўся вышэй інструктара райкома камсамола. Затое неўзабаве ўзначаліў раённае таварыства «Веды». Толькі і гэтую «канторку» хутка скарацілі. Зноў вярнуўся ў камсамол (дакладней, проста самол), але ўжо асобаю незалежнай — дырэктарам малога прадпрыемства «Ікар» пры РК.

Насіў ён звычайна светла-карычневую троечку (на гэты раз таксама быў у ёй), яна вельмі пасавала да крыху святлейшых за вопратку валасоў і бледнага твару Цягуна. Шкельцы акуляраў абавязкова мелі форму закругленых па рагах прастакутнікаў, а рукі нязменна, як толькі ён уставаў з сядзення, хаваліся ў адпрасаваных да бляску нагавіцах з вострымі, нібы лязо, кантамі. Ні даць ні ўзяць — правінцыйны арыстакрат. Нават манера весці размову ў гэтага франта мала чым адрознівалася ад яго знешнасці. Такая ж гладкая, хоць часцей за ўсё пустая. Каб дайсці да сэнсу таго, што ён кажа, трэба добра паблытацца паміж шматлікімі да месца і не да месца ўстаўленымі — «так сказать», «в принципе», «в общем», «имеется в виду»...

Толік ехаў у Менск дамаўляцца з нейкім не то лекарам, не то шаптуном, каб той наведаўся ў раён і правёў там свае сеансы. Падобныя дамовы — клопат яго малога прадпрыемства.

Для Васіля Менск — толькі пачатак шляху. Адтуль ён на самалёце памчыць у далёкую Цюменскую вобласць, дзе чакаюць яго сябры па вахце, марозны дух і высозныя нафтаздабываючыя вышкі. Васіль, калі няма на стале пляшкі, не вельмі з табою пагамоніць. Ён лепш уткне свой круглы, нібы мячык, твар у газету.

Мяне заўсёды разбірае смех, калі гляджу на Васілёў твар. Выліты калабок. Нават рот пры ўсмешцы расцягваецца гэтак жа шырока і задзірыста, як у казачнага калабка на дзіцячых малюнках. І

падстрыжаны ён заўсёды да кароткіх валасоў. А непаслухмяны віхор спераду сведчыць пра далёка не мяккі характар нашага суседа.

— Ат, ёлкі, як начытаешся гэтых газет, і жыць страшна робіцца. — Васіль усміхаеццааднымі толькі вуснамі, расцягваючы іх ці не да самых вушэй. — На, інтэлігенцыя, зірні, што пішуць.

Толік разгортвае пярэста-хрусткую газету, праводзіць па ёй позіркам праз тоўстыя выгнутыя лінзы ўдоўж і ўпоперак, а пасля засяроджваецца і, палічыўшы, што знайшоў цікавае, чытае сваім занудлівым голасам:

— Хотите знать истину?

— Га? — ускідвае галаву Васіль.

— Я не табе. Тут загаловак такі.

І Толік працягвае далей:

— Обратитесь к откровению Граля «В свете истины». Так называется книга, презентация которой состоялась... Так-так-так. Во Дворце искусств... Гм, гм. В форме лекций... Существует ли свобода воли...

— Ты не тое чытаеш. Знайшоў глупства нейкае. — Васіль незласліва хмурыць шараватыя, як цыгарэтны попел, бровы. — Там, на апошняй, пра вампіраў ёсць. І пра бацькоў, якія дзецьмі гандлююць. І яшчэ пра адну маці. Яна немаўля прыдушыла. Сваё. А на першай — пра крадзяжы і забойствы.

— Да лямпачкі мне твае крадзяжы. Нам трэба шукаць сэнс жыцця, шукаць адказ на пытанне, хто мы такія і для чаго існуем на свеце. Няўжо гэта меней цікава, чым нейкія выдуманыя вампіры?

— А-а, ідзі ты... Чыстаплюй вашывы... — Васілёва галава паварочваецца да нас стрыжанай патыліцай, а Толік працягвае крыху цішэй, часам збіваючыся на незразумелае балбатанне сабе пад нос:

— ...Это не религиозное учение. Но... Базируется на наследии Иисуса Христа... Не на наследии его... последователей. Это не одно и то же... Откуда знал тот, кто пятьдесят лет назад умер, что произойдет сегодня... Автор Абд-ру-шин... Сын света... Черпает свои познания из чистейших и высочайших источников.

— Во даюць. — Не мяняючы паставы, Васіль крутнуў галавою. — І прыдумаюць жа такое.

— Если вы тоже захотели узнать истину, пожалуйста, обращайтесь к откровению Граля. Оно уже появилось в магазинах.

— Шчэ чаго не хапала, на розную ерунду траціцца. За гэтую сваю ісціну яны, напэўна, тры шкуры здзяруць. От жа дармаеды. Што толькі не прыдумаюць, абы не працаваць, а грошы лапатаю заграбаць.

Мне надакучыла лаянка ды пустая балбатня хлопцаў, і я ўзяў са століка Толеву кніжку. У ёй пісалася нешта пра мараль, этыку, культуру.

Адна нудота, і вырашыў выйсці ў праход, што падзяляе салон і тамбур. Балазе наш плацкарт быў апошні і лёгка было юркнуць за дзверы, схавацца ад спрэчак.

У праходзе я досыць утульна размясціўся на пласцікавым вечку скрыні для смецця, дастаў з падоранага сябруком на дарогу пачка «астмы» (там мы любілі называць «Астру») пляскатую цыгарэту, з асалодаю пацягнуў гаркавы дымок. Але паглыбіцца ў роздум не паспеў. З'явіўся госць. І я б не сказаў, што жаданы. Гэта быў хлопец гадоў семнаццаці з доўгімі чорнымі пэйсамі і адвіслай ніжняй губою. Крыху згорблены.

— Чувак, — ён нахабна разваліўся побач і крыва, адным толькі кутком вуснаў, усміхнуўся, быццам паказваючы сваю ўладу нада мною, — забэніць дай.

Я насцярожыўся і пачаў пакрысе злавацца. Каму ж падабаюцца такія выхадкі? Да таго ж свядомасць пранізала думка, што ён, напэўна, не адзін у цягніку. Хутчэй за ўсё тут цэлая банда. Але працягнуць цыгарэту мяне змусіў не страх (ён калі і быў, дык у самы першы момант), а цікаўнасць: што ж будзе далей?

— Шчэ адну дай, калі не жадзён. — Ён нахіліўся, і на мяне патыхнула перагарам.

Я працягнуў яму яшчэ тры цыгарэты.

— Не. Што ты. Дзве хопіць.

— Бяры-бяры, у мяне многа, — усміхаючыся, я падумаў, што новы знаёмы не такі ўжо і дзялок, якога выпінае з сябе.

— Слухай, а ты мне білет свой не пазычыш? Далёка едзеш?

— Да Менска.

— То пазыч. Я ў Баранавічах выскачу, а білет вярну.

— О-о-о, брат, у такую далячынь выбраўся, а білет у касе не ўзяў...

— Разумееш, я не збіраўся нікуды ехаць. Ускочыў у першы ж цягнік, які трапіўся на вочы.

Хлопец усеўся побач са мною, чыркнуў запалкай. Закашляўся і колькі разоў плюнуў сабе пад ногі:

— У Пінску больш не з'яўлюся. Сучары, яны, пэўна ж, хацелі падставіць мяне, толькі я не такі дурны, каб не заўважыць гэтага.

Ён зноў плюнуў, толькі ўжо не на падлогу, а перад сабою.

— Ведаеш, мой стары — мент, маёр міліцыі. Я яго цярпець не магу. Мусар паганы. Сёння ён прагнаў мяне з хаты і сказаў, каб на

яго вочы больш не трапляўся. Х-хэ. У труне я бачыў яго... І старую, і ўсіх... Пляваў я на ўсіх з высокага слупа.

— А маці кім працуе?

— На-астаўніца, — з'едліва скрывіўся ён і дадаў: — Я ведаю, чаму яны прагналі мяне. Каб не няславіў іх перад людзьмі і, галоўнае, на працы. Ну і трасца з імі. Пражыву і сам. Мне яны яшчэ больш абрыдлі.

У гэты час дзверы ў наш праход адчыніліся, і мы падабралі ногі. Васіль і Толік усё яшчэ спрачаліся. Я ўлавіў колькі слоў.

— Ты кажаш, — даносіўся хрыплаваты голас Васіля, — што ў жыцці нічога не адбываецца выпадкова? Калі чалавек пакутуе, значыць, гэтыя пакуты заслужаныя?..

Дзверы клацнулі, і мы зноў засталіся сам-насам.

— Я пайшоў да дзяўчыны ў інтэрнат. Каб ты ведаў, якая дзяўчына! Таня. Адна яна мяне разумее. А там якраз мае карашкі: мы з імі на вакзале грошы сшыбаем, пакой адзін грабанулі, дзверы высадзілі. Маг узялі, шмоткі. Цяпер, калі што, мяне падставяць. Людзі ж бачылі мяне там. А пасадзіць мяне, што два пальцы аб асфальт. Я ж судзімы. У Баранавічах сядзеў. У цюразе хацелі пеўнем зрабіць. Ды не на таго нарваліся. Увесь сіні хадзіў, месяцамі свяціў ліхтарамі, а нат і не падумаў здавацца. На канцы я іх бачыў.

— Та-ак, — пашкадаваў я хлопца. — Цяпер табе не пазайздросціш. Слухай, а калі б табе выпала мажлівасць уладкавацца на працу і пачаць новае жыццё, згадзіўся б?

— А-а-й, — выдыхнуў вяла мой субяседнік. — Якое новае жыццё? Хадзіў я, прасіўся, а як толькі даведаюцца, што судзімы, — усё, крыж. Не, я чхаў на гэтых таўстазадых.

— А што ж ты збіраешся рабіць у Баранавічах?

— Не ведаю. Там у мяне пару карашкоў ёсць. Мне цяпер адна дарога: у цюрагу альбо на той свет. Дык ты, гэта, білет мне дасі?

— У гэтым цягніку ты не возьмеш тое, што табе трэба, ні ў аднаго пасажыра, бо ўсе квіткі ў праваднiцы.

Недзе ў падсвядомасці маёй гэтыя словы прагучалі так, што, маўляў, у гэтым цягніку ты ні ў каго не знойдзеш спагады, бо яна закратавана падазронасцю і перасцярогай.

— Калі ты не супраць, я дам табе параду. — Я сапраўды шчыра хацеў дапамагчы хлопцу. — Мне здаецца, што табе лепш за ўсё было б даехаць да Лунінца, зайсці ў міліцыю і там расказаць усё, што ты расказаў мне. І папрасіць у іх дапамогі. Думаю, цябе ўсё ж зразумеюць. А з былымі сябрамі табе лепш не бачыцца зусім.

— Не-е. Да мянтоў не пайду. Хопіць з мяне іхняй дапамогі.

— Ты не спяшайся. Я табе пра сябе раскажу.

І я пачаў расказваць яму гісторыю, якую пачуў ад свайго добрага знаёмага. Дакладней, прысвоіў тое, што здарылася з ім у юнацтве. Плёў, быццам ездзіў некалі ў Карэлію паступаць у мараходку. Там па нейкай прычыне не прынялі. Але адступацца не хацеў і дахаты не вяртаўся. Жыў на вакзале. Без капейкі ў кішэні. Згаладаўся. Толькі ваду з-пад крана хлабыстаў.

— Дык вось, — працягваў я, — аднойчы падыходзіць да мяне барыга, а з ім яшчэ чалавек пяць. Той барыга стары быў, увесь у татуіроўках. Давай грошы, кажа. Расказаў я ім, што сам тыдзень галадаю. Тады яны адышлі і праз якія паўгадзіны вярнуліся з пончыкамі, катлетамі... Віна налілі. Захмялеўшы ад ста грамаў, я заладзіў: мужыкі, паеду з вамі, куды вы, туды і я. Тады стары (ён быў за пахана) сказаў: «Калі пойдзеш з намі — загубіш сабе жыццё. Ідзі лепш у міліцыю, раскажы там усё, скажы, што прыехаў з Беларусі, і ўсё ўладзіцца». На развітанне ж ён паклаў мне ў руку дваццацьпятку. Я зрабіў так, як параіў барыга. І праўда, як у ваду глядзеў ён, спраўдзіліся ягоныя словы. Так што...

— Вой, мне пара, — схамянуўся хлопец.

Цягнік прыцішваў хаду. За акном праплыў, міргнуўшы жоўтымі вочкамі-вокнамі, будыначак вясковай станцыі.

— Ты ж да Баранавіч...

— Ды ну іх. Кантралёр наскочыць, а ў мяне грошай на штраф няма.

— Я як жа ты... Я дам табе грошы.

— Не трэба. Ён ужо адчыняў дзверы. Але раптам вярнуўся, падаў руку. — Дзякуй табе, чувак. Бывай.

Колькі хвілін пастаяўшы ля акна і паназіраўшы, як аддаляецца ў сіратлівым святле адзінокага вулічнага ліхтара цёмна-зялёная спартыўная шапачка над згорбленымі плячыма, я рушыў да дзвярэй. Мне карцела расказаць хутчэй пра выпадковую, але ў нечым сімвалічную гутарку з хлопцам, сваім спадарожнікам. Толькі не паспеў я раскрыць рот, як Васіль астудзіў мяне:

— Чулі, чулі мы ўсё. Можаш не расказваць. Ты з ім выпадкова не цалаваўся, добрая твая душа? А можа, і праўда нядрэнны быў, хто яго там разбярэ, — сказаў быццам пра нябожчыка.

— Правер кішэні. Ён у цябе нічога не спёр? — у голасе Толіка была іронія.

Гэтая абыякавасць здзівіла мяне і збянтэжыла. Гаварыць адразу ж перахацелася. Я падняўся і выйшаў у халодны грукатлівы тамбур. За брудным шклом дзвярэй праплывалі зацягнутыя цёмна-сіняю

сеткаю вечара тэлеграфныя слупы, рэдкія дрэвы, светлячкі далёкіх паселішчаў.

З гэтага моманту мне ненавісным стала Толікава шуканне сэнсу жыцця. То было не сапраўднае шуканне, а ўсяго толькі шырма, за якою цёпла і ўтульна жывецца. Ненавідзеў я і Васілёву грубую прастакаватасць. Відаць, і гэта таксама шырма, абалонка, за якою можна жыць у адноснай бяспецы. Заставалася толькі згадзіцца з невядомым аўтарам, у якога некалі прачытаў: «сумленнасць і велікадушша і праўда церпяць урон ад развіцця разумення каштоўнасці жыцця і ўласнасці». Церпяць жа. А ці добра гэта, ці так павінна быць, хто вызначыць? Пакуль будзем думаць, той зусім юны небарака павісне на суку ў якім-небудзь лясочку паміж Пінскам і Лунінцом. І мы спішам гэта на лёс.

Я зноў зірнуў у акно. Вось яно — жыццё. Гэтая цемрадзь з раскіданымі там-сям плямінамі святла, цягнік, Толік і Васіль, бадзяга, у якога я нават не спытаўся імя, нарэшце — я. Усё гэта — звычайнае, добрае і не вельмі радаснае чалавечае жыццё. І няма чаго тут мудрыць.

А сэрца ўсё ж не на месцы. От жа...

Вар'ят

Чалавек стаяў у падземным пераходзе і падпіраў прамавугольнік аблямаванай шэрым каменнем калоны, якая падзяляла паток на «туды» і «сюды». Ён нікога не чакаў. Проста стаяў і няспешна лузгаў чорныя падсмажаныя сланечнікі. Даставаў з кішэні старэнькага драпавага паліто маленькае мурзатае зярнятка, кідаў у рот, апусціўшы і без таго адвіслую непаслухмяную сківіцу, доўга калашмаціў яго задубелым ад бясконцай працы языком і пасля выціскаў вільготныя лупінкі. Яны слізгалі па зацяганым да бляску лацкане, вялізных чорных гузіках, перашытых, відаць, з ватоўкі, што адслужыла свой век, апускаліся, нарэшце, на калісьці чорныя, а цяпер проста брудныя чаравікі. Дзве лупінкі-лодачкі, якія нядаўна былі адным цэлым, зачапіліся за шчарбіну верхняга гузіка і цяпер свяціліся бялюткай сярэдзінкай, целяпаючыся на цяжкім, моцна набрынялым халоднаю вулічнаю імжою скразняку.

Чалавек нікога не цікавіў, і ніхто з прахожых, аблітых светлаю глазураю неонавага святла, не цікавіў яго. Ён нават ні на каго не глядзеў, а яго абыякавыя вочы таропіліся пад ногі ды на абутак людзей. Перад ім быццам разгортвалася цэлая энцыклапедыя... Не, не ног — чалавечых характараў. І лёсаў. Ён не ўзнімаў галаву, бо абавязкова заблытаўся б у сваім тонкім, хоць нікому і не патрэбным, аналізе. А хутчэй за ўсё баяўся глядзець на людзей...

Ногі шоргалі і цокалі, чаўкалі і праносіліся бязгучна. За салдацкімі чаравікамі падскоквалі высокія шпількі на бліскучых металічных набойках, мільгацелі гумовікі самых розных колераў. Насустрач несліся вострыя насы туфляў і ботаў, тупарылыя або з загнутымі аж наверх падэшвамі насы красовак.

«Якія бялюткія (ну, рыхтык снег). Як яму ўдаецца не выпацкаць іх у такую слоту? Чыстыя нават падэшвы. Звычайна абутак мяняе сваю форму ад формы нагі, скасабочыцца ці выпнецца ад якой-небудзь косткі. Гэтыя ж — быццам толькі што з вітрыны камерцыйнай крамы і тупаюць самі, нават не моршчацца. Ды яшчэ й без почырку: не падскокваюць, не драбняць і не запавольваюць крок, не адводзяць насы ў бакі і не крывалапяць».

Чалавек ледзь прыкметна моршчыцца: «Так, мусіць, выглядае безаблічнасць». І ён асмельваецца прыўзняць на хвіліну белы да сінявы твар, які ніколі не ведаў галення. «Хутка гаспадар гэтых чысценькіх красовак прычыніць за сабою дзверы ўласнай кватэры, не прынёсшы з вуліцы ні бруду, ні ўражанняў. Ён уважліва агледзіць пустымі вачыма абутак, павыцірае на ім плямінкі, якія, можа, шукае

праз павелічальнае шкло, яшчэ раз агледзіць, як любімы твор мастацтва, і акуратна паставіць у кут. Пасля разважліва пройдзе па чысценькай хаце, абстаўленай калі не багата, то без анічога лішняга. Затым уключыць музыку і апусціцца ў крэсла, утаропіўшыся ў столь. Гэта чалавек добра вядомай мне пароды: такія ніколі не выходзяць у дождж на вуліцу без парасона і не ездзяць без талона ў гарадскім транспарце. Салага... Мамін сыночак... Ён і ў пяцьдзесят гадоў будзе маміным пестуном. Можа, зірнуўшы на мае чаравікі, ён нават і не пагідзіўся б, бо яму на ўсё і на ўсіх напляваць».

Чалавек выціснуў наступную порцыю лупінак, а набеглы вецер-скразнячок адкінуў іх на якія паўметра ўбок, акурат пад ногі прахожых. «Перасмажаныя, халера на іх. Толькі пальцы запэцкаў. Во якія страшныя. І вусны, напэўна, такія ж...» Але вусны былі чыстыя. Вільготныя, яны блішчалі, нібыта налакаваныя, і гэта рабіла яго доўгі твар яшчэ больш непрыемным.

Чалавек злавіў сябе на думцы, што прыйшоў сюды зусім не для таго, каб назіраць за людзьмі, а тым больш за іх абуткам. Проста сярод вялікай колькасці людзей ён заўсёды адчуваў сябе адзінокім. Яшчэ больш адзінокім, чым калі заставаўся сам-насам. А ён нічога так моцна не любіў, як адзіноту. Яна была яго шчасцем, і толькі ў адзіноце ён адчуваў, што жыве, адчуваў ход жыцця і быў свядомым яго ўдзельнікам. Рэчы, што знаходзіліся побач, адразу ж асвятляліся яго пачуццямі і набывалі пэўны сэнс, яны нібы прасілі чалавека заўважаць і прызнаваць іх неабходнасць. Лічыцца з імі.

Чалавек прыйшоў сюды, каб пабыць у адзіноце. І ён сапраўды адчуваў сябе самотным. Адзінокім сярод дзесяткаў і сотняў ботаў, ног, характараў. Спачатку ён разглядаў іх (ногі) проста так... Не тое што ад няма чаго рабіць, а хутчэй, каб падкрэсліць сваю адзіноту, нагнаць паболей самоты і адчуць у ёй асалоду. Асалоду ад усведамлення свайго існавання. Але тупат і шорганне быццам наэлектрызоўвалі...

Калі зусім блізка і з цяжарам прасунуліся няўклюдныя гумовікі, чалавеку захацелася ўбачыць іх уладальніцу голаю. «Якою яна, мабыць, выглядае брыдкаю, калі распранецца. Сунецца, што тая качка. Можа, яна ніколі не распранецца пры кім-небудзь. Ногі — нібы ласты. Таму яна і хавае іх у боты, каб ніхто не ўбачыў. Калі б гэтыя ногі наступілі на мяне, я, мусіць, ніколі ўжо не падняўся б».

Чалавеку здалося, што ўвесь сустрэчны натоўп ног скіраваўся на яго і зараз затопча. «Нават вось гэтыя маленькія чырвоныя боцікі-капыткі на стройненькіх ножках-верацёнах — яны таксама будуць таптаць мяне.

У гэтых ботах, напэўна, чысценькія ружовыя пальчыкі з пакрытымі лакам малюсенькімі пазногцікамі».

Раней, калі ён думаў пра такія рэчы, адразу з'яўлялася жаданне. Яму хацелася цалаваць дзявочыя рукі і плечы. Нічога такога цяпер чалавек не адчуваў. Якое можа быць жаданне да абцягнутага мясам і скураю, няхай сабе і прыгожага з вягляду, шкілета. Чым яе косці адрозніваюцца ад касцей той няўклюднай качкі? Яны ж аднолькавыя. «Гідота. Яна радуецца, што ўсе бачаць яе дарагі абутак. А хіба ж можна такому радавацца? Хіба для гэтага Ўсявышні надзяліў людзей розумам, якога не знойдзеш ні ў адной жывой істоты на зямлі? Навошта ім гэты розум? Хапіла б такога, як у малпы. Можа, людзі і ёсць малпы. Толькі больш жорсткія, хітрыя і цынічныя».

Чалавек каторы ўжо раз адчуў, што ненавідзіць людзей. «Самая горшая, самая брыдкая істота, якая толькі ёсць на зямлі, — гэта чалавек. Прырода надзяліла яго розумам, свядомасцю, інтэлектам. Для чаго? Няўжо толькі для таго, каб ён мог прыдбаць чаравікі, якімі закрывае свае ногі ад вачэй сабе падобных?

Бедныя, бедныя людзі. Яны думаюць, што ботамі схаваюць ногі. Наіўныя. Каго цікавяць іх ногі? Каго цікавяць іх пальцы, пазногці, лыткі і пяты? Небаракі. Яны нават і не падазраюць, што, закрываючы плоць, адчыняюць сваё нутро, адкрываюць нешта патаемнае са сваёй натуры. Кожная маршчына на іх абутку, кожная пляма, драпінка або нават колер і фасон гавораць пра чалавека амаль што ўсё».

Натоўп плыў і плыў. Але ніхто яго не затоптваў. Некрануты заставаўся нават дыванок, што саткаўся сам па сабе з лупінак і абляпіў яго шэрыя ад высахлай гразі чаравікі, неахайна сцягнутыя белымі матузамі. Чалавеку прымроілася, што людзі рухаюцца не «туды-сюды», а па замкнёным коле.

«Я ўсё зразумеў. Гэта такі ў іх дзікунскі танец. Перш чым прыкончыць мяне, яны будуць доўга танцаваць вакол. А пасля накінуцца і будуць таптаць, баючыся згубіць або парваць свой паганы абутак. А я не баюся страціць нават сваё жыццё, бо я не такі, як яны. Я не магу жыць разам з імі, таму нехта з нас павінен памерці.

Чаму ж я раней адносіўся да людзей як да сваіх братоў і не мог зразумець, што чалавек — гэта не што іншае, як згустак звярынай плоці і эгаізму.

Калісьці я думаў, што чым большую чалавек займае пасаду, тым ён разумнейшы, адказнейшы, і тым больш яго трэба паважаць. Але ўсё гэта — лухта. Яны — эгаісты. Чалавеку надакучыла насіць абутак са штучнай скуры, і ён дамагаецца, каб пасада дазваляла яму насіць з натуральнай, ды яшчэ самай лепшай. Усё вельмі проста. І палітыкі, і

прэзідэнты думаюць найперш не пра сваю дзяржаву і народ, а пра самыя лепшыя і самыя дасканалыя туфлі».

Зусім побач прашумела доўгая чорная мантыя. Паветра ўскалыхнулася, і шалупінне, нібы спалоханая вераб'іная чарада, адляцела ад самых ног чалавека. Дыванок змяніў форму з амаль што правільнага паўкруга на няправільны, абрэзаны з аднаго боку.

«Святар. Гэта прайшоў святар. Сур'ёзны і нават суровы. Я толькі адзін раз быў у царкве — у дзяцінстве. Але я часта бачыў святароў па тэлевізары: яны чытаюць казанне або разважаюць пра душу. Таму я ведаю, што ўсе яны на адзін твар. А тады, у дзяцінстве, я бачыў, як людзі неслі ў царкву хлеб, віно, кілбасу. Дзіўна, але мяне не цікавілі ні залачоныя кандэлябры і рамкі, ні каляровыя малюнкі з выявамі святых на сценах і нават на столі, ні дзіўны пах, які браўся невядома адкуль. Мяне, блазнюка, цікавіла, чаму гэта людзі нясуць сюды, у такую вялізную, багатую і таямнічую пабудову пітво і ежу. І яшчэ, прыкмеціў, грошы. Запытаўся пра гэта ў маці, а тая толькі засмяялася і сказала вельмі проста:

— Так павялося, сынок. Так патрэбна.

Я тады дзіцячым розумам падумаў: ці то нясуць усё таму, што месца гэтае — велічнае, святое, ці гмах гэты пабудавалі і панаставілі ў ім залачоных рэчаў ды намалявалі шмат прыгожых карцін для таго, каб сюды неслі кілбасы».

Ён адчуваў, што тут не ўсё так проста, і ўсё ж непрыязнасць да святароў засталася назаўсёды. Хоць яны п'юць і ядуць як і ўсе, і плоць іх як ува ўсіх людзей, і ёсць у іх на пальцах ног пазногці, і жаданні ў іх таксама чалавечыя. Дык нашто ж гэты ўвесь маскарад? Няўжо каб браць, каб нешта браць для сябе? Як бяруць жабракі ці пагарэльцы, што амаль з дня ў дзень шнырацьпа кватэрах, просяць міласціну. Дык яны хоць не прыкідваюцца: прыходзяць і кажуць, каб даў ім што-небудзь паесці, грошай або анучу якую. Ён даў бы ім многа, ды ў самога нічога няма. Хлеб ды сала. Але цяпер ён іх таксама ненавідзіць. Як і ўсіх людзей. Бо яны бяруць, бяруць, бяруць. Ён любіць толькі вар'ятаў. Гэтым мілым істотам зусім нічога не патрэбна. Яны калі што і просяць або бяруць, то не свядома, а, хутчэй, інстынктыўна. Тыя, што называюць сябе нармальнымі, таму і пазбаўляюцца ад іх, таму і хаваюць іх у бальніцы-турмы, каб не нагадвалі ім лішні раз, што ногі зусім не абавязкова хаваць у боты і зусім не абавязкова разумнічаць, каб жыць і быць шчаслівымі.

Вочы чалавека раптам загарэліся, і чырвоныя беражкі павекаў сталі вільготныя.

«Адкуль ты ўзяўся, хлопчык?»

Перад ім стаяў хлапчук гадоў дзесяці ў насунутай на самыя вочы вялізнай вельветавай кепцы, расцягнуўшы вусны да самых вушэй, сушыў дзёсны, бо быў шчарбаты.

— Дзядзька, дай семак, — сказаў ён, гулліва паводзячы вачамі і варушачы мускульчыкамі свайго рабога і непрыемнага твару.

Чалавек дастаў з зашмальцаванай кішэні поўную жменю семак і напоўніў прыгаршчы малога. І ўсё нешта казаў, хоць і не чуў сваіх слоў.

А хлопец бяздумна ўсміхаўся і не слухаў яго. І чалавеку гэта падабалася. Яму ж ніхто не патрэбны, як нікому не патрэбны і ён.

Але хутка чалавек устрапянуўся, быццам нешта ўзгадаў, і схапіўся за галаву. «Я такі ж, як і ўсе людзі. Малы ўзрадаваўся. Усмешка на ўвесь шчарбаты рот. Яму я хацеў зрабіць прыемнае. Яму. Не сабе. То чаму я радуюся яго дурнаватай усмешцы? Я ж зрабіў прыемнае самому сабе. Я такі ж эгаіст, як і ўсе людзі. Але я не хачу быць падобны да іх».

І ён схапіў хлопца за рукаў, павалок у канец тунеля і знік у кволым сонечным святле, прыкрытым празрыстай шэра-блакітнаю фіранкай халоднай восеньскай імжы.

Застаўшыся без гаспадара, лёгкі чорна-белы дыванок з шалупіння пачаў паціху раскідвацца. Лупінкі адносіліся ўсё далей і далей ад калоны ветрам і падэшвамі прахожых. Праз хвіліну на гэтым месцы варушылася ўсяго некалькі лодачак, некаторыя ў лужынах-кроплях, прынесеных нагамі з вуліцы.

А ў гэты час чалавек, моцна сціскаючы хлапечую руку, цягнуў яго на прыдарожнае ўзвышша, дзе маўкліва раскінулася невядома калі распачатая будоўля. Здалёк здавалася, што ён трымае ў руцэ чорны пусты мяшок: такая вялізная і бясформенная была ў малога куртка.

— Дзядзька, а чаму вы цягнеце мяне на гэтую гару? — хлопец узняў галаву, і яго ўсмешка здалася чалавеку яшчэ больш ідыёцкаю, чым была: ад холаду яшчэ больш скрывілася.

— Хачу табе нешта сказаць.

— Там лепш сказалі б, а то вымакнем як цюцькі.

— Ты хто такі будзеш? — запытаўся чалавек, калі яны апынуліся сярод будаўнічага друзу і параскіданага ламачча, нешта вышукваючы каля пакладзеных у штабелі бетонных перакрыццяў.

— Не ведаю, чалавек, мусіць. Толькі неданошаны.

— Чаму неданошаны?

— Бацькі так казалі. Яны мяне праз гэта і з хаты выгурылі. Называлі чмыром. А чаму вы мне не гаворыце тое нешта?

— Зараз, зараз скажу. Вось толькі... — Чалавек запнуўся, нешта знайшоўшы сярод скінутых у кучу шэрых дошак-апалубак, пабітых чырвоных цаглін і цюкоў шклаваты, падобных да скручаных вагонных матрацаў. Выпрастаўся, трымаючы ў руцэ з паўметра пругкага і досыць тоўстага сталёвага дроту, і твар яго пасвятлеў, быццам выслізнула з-за хмараў бляклае, размытае вільгаццю сонца.

Яны стаялі адзін насупраць аднаго: малы, узняўшы галаву і працягваючы ўсміхацца, і дарослы, згорбіўшыся і падстаўляючы выцвілую белую патыліцу вострым, як іголачкі, кропелькам. Ён думаў, што хлапчукова ўсмешка цяпер якраз да месца.

— Я не сказаў ты табе ані слова, калі б ты мог зразумець мяне. Я зусім не хачу, каб мяне хто-небудзь разумеў. Але ты — дурань і таму маеш права не толькі слухаць, але і бачыць тое, што разумнаму бачыць не дазволена. Так, не дазволена, бо ён мае звычай ва ўсё ўмешвацца і замінаць іншым рабіць тое, што ён лічыць непатрэбным ці шкодным. Калісьці я таксама быў такі, як і ўсе. Меў пасаду, вялізную кватэру, прыгожую жонку, любіў хаваць сваё цела ў чысценькія кашулі, а ногі — у цёплыя і модныя чаравікі. Я пасміхоўваўся з таго, што людзям падабалася мая знешнасць. Яны ж не ведалі, якое ў мяне непрыгожае, нават брыдкае, бляклае і безвалосае цела і якія доўгія і касцістыя пальцы на нагах. Аднойчы нешта са мною здарылася, і я пачаў бачыць зусім не тое, што трэба. Мне здавалася, што людзі, якія заходзяць у мой кабінет, заводзяць не дзелавыя размовы, а абзываюцца самымі зневажальнымі словамі, не ляпаюць далонямі па маім плячы, а імкнуцца сарваць пінжак, усю вопратку і пасмяяцца з майго няскладнага цела, не ўсміхаюцца, а вышчэрваюцца, не падпісваюць дзелавыя паперы, а малююць у іх карыкатуры пра мяне. Тады я накідваўся на іх, ірваў паперы і выкідваў сваіх крыўдзіцеляў за дзверы. Мяне звольнілі. Але гэта не дапамагло маёй хваробе. Калі жонка схілялася нада мной у пасцелі, каб пацалаваць, я ўскокваў, бо мне здавалася, што яна вось-вось уп'ецца зубамі ў мае вусны, нос, скіўіцу. І не проста ўкусіць... Я пайшоў з хаты і палюбіў адзіноту. А каб атрымліваць ад яе сапраўдную асалоду, ішоў туды, дзе шмат людзей, якія на мяне не зважаюць. Такія — яны для мяне не вельмі страшныя. Але на твары я ўсё роўна стараюся не глядзець — так спакайней.

Цяпер я вырашыў... Мяне змусілі гэтыя бяздушныя і жорсткія істоты зрабіць гэты крок. Бо калі не зраблю, яны выцягнуць з гэтага цела (і ён зірнуў на сваё беднае паліто, быццам хацеў позіркам пранізаць яго) мяне, і вызваленае месца зойме нехта іншы, падобны да іх. Такога гвалту я не сцярплю. Ніхто не мае права распараджацца

маім целам і маім розумам, бо яны мае, а не іхнія, як і гэтае паліто. Хіба я хацеў калі-небудзь перарабляць іх на свой лад?

Карацей кажучы, я рашыўся. Глядзі, але нічога не спрабуй зразумець, бо табе гэта не пад сілу і зусім не патрэбна табе.

Чалавек задраў галаву і зірнуў у неба. Зрэнкі раптам шырока раскрыліся і памутнелі, як мутнее мылкая лужына ў навальніцу. Пасля спыніў свой позірк на хлапчуку, утаропіўся ў яго зашклянелымі вачыма, але ідыёцкай усмешкі не ўбачыў, як не ўбачыў бетоннага шкілета будучага будынка, захінутага ў анямелую шэрань горада, самотнай бясколернай далячыні...

Чалавек ужо не цікавіў хлапчука, і той збег уніз, паплёўся да лаўкі на аўтобусным прыпынку. Пад драўляным навесікам тут смаліў цыгарэту элегантны з выгляду, высокі малады чалавек.

— Дзядзька, там нейкі мужык забіўся. Ён мне семак даў, — сказаў малы, адкрыўшы ўсмешкаю шчарбаты рот і паказваючы поўную жменю семак сланечніку.

— Дзе забіўся?

— Во, на гары.

* * *

Першы снег асвятліў і без таго не цёмны бальнічны пакой. Чалавек расплюшчыў вочы, асцярожна азірнуўся вакол сябе. «Белыя капюшоны і такія ж халаты. Можа, гэта той свет?»

— Ну што, брат, ажыў? Даў ты нам клопату. Усе кішкі дротам перапароў. Цыравалі, што тыя панчохі. Цяпер сто гадоў будзеш жыць... Калі не зап'еш, канечне...

Словы ўспрымаліся чалавекам як цынічная, спапяляючая насмешка. «Бандыты, яны пазбавілі мяне права распараджацца сабою, і ўсё каб парадаваць сябе, наталіць сваё ненажэрнае самалюбства. Ахвяравалі мною дзеля сваёй хвіліннай уцехі».

— Ненавіджу вас. Як жа я вас не-на...

Чалавек асунуўся, і галава яго на вачах у здзіўленых эскулапаў знясілена адкінулася на белую падушку.

А ў гэты час у падземным пераходзе падпіраў аблямаваную шэрым каменем калону хлапчук у нацягнутай на вочы вялізнай вельветавай кепцы і лускаў чорныя семкі, час ад часу адорваючы прахожых сваёю ідыёцкай шчарбатаю ўсмешкай.

Ёрчыкаў слуп

Спачатку людзі не верылі, што Ёрчык, гэтакі гаспадарлівы мужык, няхай сабе і дзікаваты, ды зусім з глузду з'ехаў. І калі ніхто ў вёсцы ўжо не сумняваўся ў тым, пачалі людзі дзіваку розум устаўляць:

— Апамятайся,— казалі яму.— Пашкадуй дзяцей, жонку пашкадуй. Яна ж у цябе залатая. Да таго ўжо цярплівая, што іншай такой і ў свеце не знайсці. Што ты за дурату ў галаву ўзяў? Мёртвых не паднімеш — пра жывых думаць трэба. А ты ўсё дабро на вецер пускаеш.

Ёрчык жа толькі слухаў ды пасміхаўся ў пажаўцелыя вусы, а пасля гаварыў:

— Глядзіце, колькі вас. Процьма. Не злічыць. І ўсе вы пра жывых думаеце. А некаму ж трэба і пра мёртвых. Во, праз дарогу ад маёй хаты старыя могілкі. Зайдзіце ды гляньце — там крыжы палеглі на зямлю і тлеюць, а ўзгорачкі магільныя ямкамі сталі. І гаспадарацъ там вецер ды крумкачы. Закапалі і забыліся — пра жывых думаем. І я пра жывых думаў некалі, а цяпер — пра мёртвых. Чаму? Не ведаю. Мусіць, так трэба. І адгаворваць мяне — пустое. Ідзіце і займайцеся сваім, а я — сваім.

Так ён адказваў кожнаму. І ўсе вярталіся ад яго ні з чым. А потым і зусім хадзіць перасталі, адно са спачуваннемківалі галовамі.

Жонка спачатку была спакойная, потым здзіўлена пытала:

— Нашто табе столькі камення? Чаму ты аддаў усе грошы на цэглу? Тут хопіць на дзесяць дамоў.

— Людзі страцілі памяць, і мне трэба яе адбудаваць.

— Хіба ж памяць робіцца з камення?— яшчэ больш дзівілася жонка.

— Камень — самы трывалы з усяго, што стварыла прырода.

— Чаму ж якраз табе ўздумалася брацца за гэта? Няхай бы ўсе разам альбо нехта іншы.

— Не магу сказаць, бо і сам не ведаю. Упэўнены, што нікуды ад свайго не дзенуся. Трэба, і ўсё тут.

Жонка адыходзіла, а пасля плакала каля мурзатага прыпечка, моўчкі пазірала, як муж, заняўшы ўвесь агарод, выкладае на ім нешта агромністае і круглае. Знізу ён устрончыў у зямлю велізарныя валуны. Унутр клаў на цвёрды каменны падмурак цэглу, белую і чырвоную — якая траплялася пад рукі, змацоўваючы ўсё гэта цэментам. Работа ішла марудна. За паўмесяца адолеў метры два, не болей. Але наперадзе — усё лета і восень. А можа, нават яшчэ і зіма, калі будзе цёплая. Ды шмат жа яшчэ і гадоў наперадзе.

І Ёрчык будаваў, надрываючыся, а жонка ўсё плакала, дзяцей шкадавала.

Калі чалавек пачаў выносіць з хаты і прадаваць самыя дарагія рэчы, ад вопраткі да шафы, жонка не вытрымала і з'ехала з малымі некуды далёка — да сваякоў. Яна думала пра жывых, пра сваіх дзетак, і нічога іншага зрабіць не магла.

Вось такою атрымалася ў мяне прыказка. А сама казка, канешне ж, яшчэ наперадзе.

* * *

Вёска, дзе жыў дзікаваты Ёрчык, называлася Чыргі. Яго хата стаяла якраз на ўездзе або на выездзе — гэта ўжо з якога боку ехаць. Счарнелая, з аблезлымі аканіцамі, сіратліва глядзела яна на дарогу, на здзічэлы лес, які быў нядаўна могілкамі. У спальні каля печы стаяў вялікі драўляны ложак, пад акном — куфар, у зале — стол і на кухні таксама стол. І ўсё самаробнае. Маленькі абразок вісеў у зале пад столлю — якраз насупраць дзвярэй. Нават ціканне гадзінніка, што запаўняе звычайна кожнае жытло і нагадвае людзям, што час няўмольна бяжыць і трэба спяшацца нешта рабіць, тут змянілася нуднаю цішынёю. Быццам бы і не жытло гэта зусім, а вялізная труна.

Але ж і тут, у гэтай хаце, неўзабаве пачалі з'яўляцца, хоць і зрэдку, госці. Хто? Звычайныя вясковыя п'яніцы, якія нарэшце знайшлі сабе добры прытулак, дзе можна было спакойна асушыць пляшку ды яшчэ й пагаманіць. Ніхто не лаецца, ніхто не зыркае нядобрым або насмешлівым вокам.

— Ты, Ёра, дурнаваты нейкі. На халеру гробіш сябе гэтай сваёй дурнатою. Я дык ужо, ясна, кончаны чалавек. Алкаш. Але нат з мяне людзі не смяюцца так, як з цябе, — разважаў ахрыплы ад «Беламору», з чырвонымі вачыма і адубелым тварам стары Лявон, адстаўляючы ў кут пустую бутэльку. — На чорта табе здалася гэтая камяніца. Так глянуць, то быццам ты і пры сваім розуме. І ладна ўсё ў цябе атрымліваецца. А нашто, каму яно патрэбна — ну ніяк не дапетру...

Ёрчык таксама піў. Чалавек жа, а не анёл які. Але нямнога, каб не страціць памяці. А мірыўся ён з гасцямі толькі таму, што вечарамі станавілася маркотна на душы. П'яніцы ж былі найлепшай кампаніяй — не пагарджалі. І гаварылі шчыра. Нечым ён з імі радніўся.

— Вось ты мне скажы, Ёрчык, як жа ты харчавацца будзеш? Цалюткі дзень сваю камяніцу правіш, а прыйдзеш у хату — нічога не зварана. Была жонка — і боршч быў, і бліны, і яечня... Не, як сабе хочаш, а ты ўсё ж дурнаваты.

— А ты што, жывеш, каб есці, ці ясі, каб жыць? — пачынаў тады сваю філасофію Ёрчык. — Бліны-ы, бо-о-ршч. А я сала напруся, бульбы звару альбо супчыку грыбнога (у мяне мех грыбоў у запечку вісіць), і нічога больш не трэба.

— Скуль жа ў цябе тое сала? І бульбу ты не садзіш.

— А я дзежачку чалавеку скляпаю, ён і прынясе ладны кавалак. Другую — і бульбы мех ёсць. А пчолы, думаеш, нашто ў мяне? Ведаеш, які цяперака мёд дарагі. Во табе і заробак. Пакуль рукі мне служаць — не прападу.

— Ведаю, рукі ў цябе залатыя. А вось у мазгах клёпак не стае. Бач, да чаго дажыўся — жонка з дзецьмі з хаты ўцякла. Няўжо не шкода?

— Шчэ як шкода, Лявон. Часам і заплачу ў закутку. Але што зробіш, калі такі лёс мне выпаў?

А ранкам Ёрчык выносіў з хаты вялізную шуфлю, вёдры, розныя жалязякі і браўся за справу. Найперш ён напаўняў каменнем вёдры, прывязваў да іх вяроўкі, другім канцом якіх абвязваўся сам, і па жалезных прутах, што тырчэлі ў сцяне, як па лесвіцы, узлазіў наверх. Цяпер ён быў ужо вышэй нават яблынь і самых высокіх грушаў. Глядзеў уніз, і людзі здаваліся яму кузуркамі. Пазіраў без аніякай цікаўнасці, як гоняць пастухі кароў, як снождаюць па вуліцы яго суседзі.

«І ўсё ім нешта трэба, — думаў ён. — Круцяцца, круцяцца, як тыя вавёркі, нажываюць дабро... А навошта, каб хто іх спытаў? Яны і самі не ведаюць. А пасля паўміраюць, і ніхто пра іх не ўспомніць. Дык каму патрэбна такое жыццё! Але што мне да іх. Яны жывыя. А мне трэба думаць пра мёртвых. Мусіць жа, я для гэтага і на свет нарадзіўся».

І Ёрчык цягаў наверх цяжкія вёдры з каменнем. Бывала, наведваўся хто-небудзь з тых, хто любіў гасцяваць у яго вечаркам. А часцей за ўсіх — Бронь. Зверху яго пазнаць гэтак жа лёгка, як і з зямлі, — па вялізнай бліскучай лысіне. Ён часам, калі бываў на падпітку, падзываў да сябе хлапчукоў і паказваў фокусы.

— Хочаце, выму вока? — казаў ён.

— Ыгы, — адкрывалі тыя раты.

І ён сапраўды вымаў пальцамі правае вока і даваў яго здзіўленым гледачам. Вока аглядалі, мацалі рукамі... Малыя былі вельмі задаволеныя.

Вока ж тое было шкляное. Пратэз. Сапраўднае ён страціў недзе пад Берлінам на перадавой.

Дык вось ён, гэты Бронь, падыходзіў да Ёрчыкавай камяніцы і крычаў:

— Памагай Бог, ахмэлак ты прыдуркаваты.

— Казаў Бог, каб і ты памог, аблуда аднавокая, — чулася з вышыні.

— Спускай сюды свае збаны!..

І ў адказ чулася бразганне вёдраў па каменнай сцяне. А праз хвіліну-другую ўжо чулася задыханае і з'едлівае «віра-віра...». Такім жа чынам падымалася гліна, пясок, цэмент і ўсё астатняе. Часам Бронь працаваў разам з Ёрчыкам да самага вечара.

Быў ён тут і за карэктара, выпраўляў памылкі. Справа ў тым, што «стваральнік памяці» цэглу клаў не абы-як, а выкладаў з яе прозвішчы нябожчыкаў. Для літар браў белыя цагліны, астатнюю прастору запаўняў камянямі, чырвонай цэглай.

Атрымалася прыгожа. Знізу сцяну апярэзваў надпіс, буйнейшы за астатнія: «Гэта памяць усім, хто калі-небудзь жыў у вёсцы Чыргі». А вышэй ішлі прозвішчы. Многа — сотні прозвішчаў. Хоць і вёсачка ж, здаецца, невялічкая.

А сцяна — нібы брук. Гэтак ладна падабраны камяні.

— Слухай, верхалаз, а як жа з тымі, хто яшчэ жывы? — манты-ляецца ўнізе кудлатая чупрына Сліўкі, суседа праз тры хаты. — Хто іх у тваю «памяць» упіша? Што яны, горшыя за памерлых?

— А от, — смяецца з вышыні Ёрчык, — знойдзецца ж нехта іншы, заменіць мяне.

— А як не?

— Знойдзецца, не хвалюйся. Дзівакоў ва ўсе часы не бракавала.

— Ну, а як усё ж не заменіць?

— Ну не заменіць, дык што ж. Значыць, будзе як будзе.

— А-а, значыць, не дадумаў ты нешта. Калі памяць, то ўсім павінна быць памяць.

— Можа, ты дадумаеш. У цябе галава вунь якая вялізная. А яшчэ з чупрынаю — дык о-о-о!..

— На чорта мне яе ўсялякай лухтой забіваць. Хопіць на вёску і аднаго дурня.

І Сліўка садзіўся на перакулены вазок, паліў. А пасля, як і Бронь, запаўняў вёдры каменнем, глінаю ды пяском...

Так і будаваў «мясцовую памяць» дзікаваты Ёрчык. Ішоў год за годам. За гэты час памёр не адзін жыхар Чыргоў, бо жылі тут амаль адны толькі старыя. Ці не ў кожнай хаце ўжо карысталіся Ёрчыкавымі дзежкамі. І мёдам ласаваліся амаль усе. А пасля «стваральнік

памяці» памёр, паспеўшы ў апошнія дні жыцця выкласці на самай вышыні сваё прозвішча і імя.

* * *

З таго часу мінаў не год і нават не дзесяцігоддзе. Памерлі дзеці тых, хто быў аднагодкам Ёрчыка. Могілкі зараслі лесам. А на месцы вёскі раскінулася поле. Нішто ўжо не нагадвала пра тое, што некалі тут густа цвілі вішні ды яблыні, бегала па вуліцы шчабятлівая малеча, мітусіліся заклапочаныя людзі.

Толькі пярэсты ад шматлікіх прозвішчаў слуп непарушна ўзвышаўся над маўклівай бязмежнай роўняддзю. І калі нехта праязджаў непадалёку па дарозе, абавязкова звяртаў на яго ўвагу і задзіраў галаву. А пасля тлумачыў каму-небудзь з тых, хто ўпершыню ў гэтых мясцінах:

— Калісьці тут стаяла вёска Чыргі, а ў ёй жыў нейкі дзівак (яго прозвішча выкладзена, кажуць, на самым версе і адсюль не бачна), які ўзвёў гэтую камяніцу. Будаваў памяць, хе-хе.

— Гм, і сапраўды. Атрымалася памяць... Ці ж не праўда?

Людзі пацiскалі плячыма і думалі пра сваё. Можа, пра жывых.

Чорная вавёрка

Маё далёкае-далёкае дзяцінства непарыўна звязана з лесам. Я гойсаў з такімі ж дзікаватымі падшыванцамі, як і сам, па непралазных гушчарах, па дрэвах, нібы малпа, палохаючы казуль, лісіц ды зайцоў, якіх было тады процьма. Мы вазамі вазілі з лесу грыбы і кошыкамі лавілі рыбу ў лясных балоцістых сажалках, сябравалі з бабрамі, кармілі хлебам і чарвякамі птушанят у гнёздах і яшчэ паспявалі з дня ў дзень пасвіць чараду кароў.

Аднаго разу, загнаўшы свой паслухмяны і памяркоўны статак у чарамшаннік, мы (гэта значыць, я, Колька Сымонькаў ды яшчэ двое меншых за нас падшыванцаў, якія ніякай ролі ў маёй гісторыі не адыгралі) распалілі невялічкае вогнішча, пагулялі з ножыкам (хто прайграваў, той зубамі выцягваў з зямлі моцна ўбіты калочак), дасталі з кішэні некалькі бульбін і загарнулі іх у гарачыя вугольчыкі, пасля малыя нашукалі рыжыкаў, і мы падсмажылі іх разам з салам, нанізаўшы на лазовыя пруткі. Паснедалі, паразлягаліся, выставіўшы ўверх жываты (балазе, каровы хадзілі побач і добра чутно было, як храбусціць, рвецца ў іх моцных зубах жорсткая лясная трава). І тут я заўважыў на адной з высачэзных і галюткіх да самай вяршыні асін дупло, а ў ім вostранькую чорную мордачку — рухавую і надта ж цікаўную.

— Глядзіце, — паказаў я мурзатым ад вуголля, тлушчу і абгарэлай бульбы пальцам на дупло, — вавёрка. Чорная вавёрка.

— Чорных вавёрак не бывае, — запярэчыў нехта з малых, калі галава звярка вытыркнулася зноў.

А вось і бываюць, не здаваўся я. Чырвоныя жывуць на хвоях, а чорныя — на асінах. — Цяпер мне аж сорамна, что я — дзіцё лесу, аказваецца, так мала ведаў пра яго насельнікаў. Але спішам гэта на ўзрост.

Колька не ўлазіў у нашую спрэчку, толькі павёў вачыма на вершаліну асіны, зноў заплюшчыў іх і працягваў драмаць, закінуўшы нагу на нагу і насунуўшы на нос кепку.

Мяне разабрала цікаўнасць.

— Палезу, — рашуча сказаў сябрукам.

— Не залезеш. Высока і сучкоў няма.

— Затое ў мяне рэмень ёсць.

З дапамогай гэтай вельмі карыснай ва ўсіх адносінах штукі я досыць хутка дабраўся да малюсенькага дупла. Пачаў запіхваць усярэдзіну руку і ледзь-ледзь прасунуў. Там намуляў нешта мяккае, цёплае і дрыготкае. «Ага, вось ты дзе». Зараз жа схапіў яго, і разам са

звярком рука сама выскачыла з вузенькага лаза (можа, так думаю цяпер, ад страху, які падвойваў сілу). Дзіўна, але ў сваёй хаце звярок не кусаўся, а тут ушчаперыўся ў кончык пальца і ледзь не прапароў навылёт. Я прыціснуў яго да нагі, але ён як бач пракусіў мае дзіравыя нагавіцы. Заенчыўшы ад болю, я, зусім не разумеючы, што раблю, кінуў зубастае стварэнне на зямлю.

Пасля гэтага вырашыў праверыць, ці не засталіся ў дупле маленькія вавёрчаняты. Іх аказалася двое. Але гэтыя былі не страшныя. І я злез, паклаўшы іх за пазуху.

Кінуты мною звярок ляжаў на мяккім травяным дыване мёртвы.

— Мусіць, ад страху акачурыўся? Прама на ляту, — выказалі здагадку малыя.

Я падарыў ім свае малюсенькія пушыстыя трафеі, забінтаваў рану на пальцы палосачкаю тканіны, адарванаю ад анучы, у якую было загорнула сала, а Сымонькаў Колька дастаў з кішэні складанчык, і мы ўсе разам абступілі звярка. Вельмі ж карцела дазнацца, што ў яго там за вантробы, у гэтага малога і доўгага чорнага драпежніка. Але як толькі чэрава пад лязом разышлося, хуценька пазатыкалі насы.

— Бэ-э, які смярдзючы, — завылі малыя.

— Ф-фэ, гадасць нейкая, — скрывіўся Колька і шпурнуў знэнджанага звярка ў карчы. Але яго як бач знюхаў сабака — наш верны пастушок Ваўчок, і Сымонька падвесіў маю чорную вавёрку, да якой я страціў усялякую цікавасць, на сучок далей ад кастра.

На гэтым і завяршылася б адна са шматлікіх гісторый майго дзяцінства, і вы ніколі не даведаліся б пра яе (бо цікавага, а тым больш надзвычайнага ў ёй вельмі мала), калі б праз цэлых сем гадоў не падарыў мне лёс яе працяг. Здарылася гэта нечакана, калі з памяці пачалі ўжо сплываць паціху малюнкі дзяцінства.

Быў адзін такі вечар, калі я наважыўся правесці з танцулек Сымонькаву Ярыну — старэйшую Колеву сястру (тады ён быў ужо ў войску, а я збіраўся адправіцца за ім услед толькі вясною). Не хачу перад вамі хваліцца, але што было, тое было. Правесці Ярыну дахаты лічылася ў нас вялікім гонарам нават для хлопцаў старэйшых, не тое што для мяне — кавалера саплівага. Толькі так ужо неяк атрымалася: я запрасіў яе на вальс, і ў той момант, калі мы кружыліся (прабачце — таўкліся) у цеснай хаце сярод іншых пар, я папрасіў у яе дазволу правесці дахаты. Яна адразу ж згадзілася, і гэта было дзіва з дзіваў. Я ледзь дачакаўся, пакуль гарманісты схаваюць у футаралы свае галасістыя інструменты і не зводзіў з яе цнатлівых закаханых вачэй.

Ярына была ў белай, размаляванай дробненькімі кветачкамі, сукенцы, у боціках, якія цяпер, ведама ж, сілаю не прымусіў бы

насіць ні адну дзяўчыну, але якія тады лічыліся сапраўднаю раскошай (такіх не было ні ў адной яе сяброўкі, і ўсе танцавалі ў чаравіках), а валасы яна сабрала ў вялізны, як круглы бохан, гугель. Ярына была як выспеленая вішанька. Здавалася — яшчэ год-два, і пераспее.

З хаты мы выходзілі апошнімі, і я з прагнасцю назіраў, як грацыёзна яна накідвае на рухавую мілую галоўку квяцістую «марыканськую» хустачку, стараватае, але гожае паліто з бліскучым чорным каўнерыкам — бадай, самым багатым яе ўпрыгожаннем.

— О-о, які хвайны каўнер. З куніцы хіба? — мне трэба было нешта сказаць, каб яна не думала, што ў мяне ад шчасця заняло мову.

— Ага, з куніцы, — ганарліва пацвердзіла яна.

І ўжо калі мы выкаціліся на блакітную і рыпучую ад снегу і моцнага марозу сцежку, яна расказала тое, што пачула ад бацькі. Гэта была тая самая гісторыя, якую я расказаў вам вышэй. Толькі не было ў ёй мяне (ці то Колька, расказваючы бацьку, знарок не ўпамянуў маё імя, ці бацька забыўся, хто тады лазіў на асіну), а быў зусім кароценькі працяг. Ды вы ўжо і самі, напэўна, здагадаліся, які ён. Надвячоркам Колька, які добра ведаў, што гэта была ніякая не чорная вавёрка, а каштоўны футравы звярок, збегаў на тое месца, зняў мёртвую куніцу з сучка, а бацька — прызнаны ў акрузе майстар па вырабе скур, зрабіў з яе гэткі ладны каўнерык.

Ярына ж свой расказ завяршыла так:

— Той дурань, мусіць, і цяпер яшчэ думае, што на свеце існуюць чорныя вавёркі, — і залілася вясёлым, зусім не з'едлівым смехам.

Я крануў тады футра, што абляпіла яе шыйку, і рука мая быццам зноў правалілася ў тое ненавіснае дупло: гэткае ж мяккае і цёплае, быццам бы гэта жывая «чорная вавёрка». Я хацеў сказаць ёй, што дурань той несусветны стаіць зараз перад ёю, але ж занадта блізка апынуліся нашы твары, і мы моўчкі пацалаваліся. Для мяне той пацалунак быў першы ў жыцці, і я разгубіўся, пачаў хаваць вочы, а яна, пэўна ж, цалаваная, і не раз (няхай прабачыць мне мая жонка за гэтыя словы), толькі гарэзліва засмяялася і штурханула мяне ў пушыстую гурбу.

— Ну што ты за кавалер такі, нясмелы зусім. Заечая твая душоначка.

І яна навалілася на мяне, пачала закідваць снегам. Ён калоў і апякаў твар, але затое ўзбадзёрыў, ажывіў, і я, загробшы Ярыну ў абярэмак, перакуліў яе цераз сябе, насеў зверху і, назіраючы, як растаюць на расчырванелым, свежым далікатным тварыку халодныя крышталікі, хутчэй выдыхнуў (баючыся, што пасля ўжо не асмелюся):

— Гэта ж я той дурань, які лічыў куніцу чорнай вавёркай, — і хутчэй, баючыся, што ад гэтых слоў яна зніякавее, дадаў: — Але я вельмі рады, што яна дасталася табе.

Ярына не зніякавела. Не той характер. Ды ўсё ж не змоўчала. Калі мы ўразвалачку падыходзілі да яе хаты, прапанавала:

— Мне нешта не па сабе. З табой так паскудна абышоўся мой брат. Лепш я аддам табе гэты каўнер. Ён жа твой. Ты ж калісьці нацярпеўся з-за яго.

— Што ж, — адказаў я, — няхай будзе мой. Але я дару яго табе. Гэта мой табе падарунак.

— Не, гэта занадта дарагі падарунак. Я не прыму яго.

— Тады давай пажэнімся, і ён стане нашым, — выпаліў я і зарагатаў, бо калі б не зрабіў гэтага, то згарэў бы ад сораму пасля такой дзёрзкасці.

— А-а-а, бач ты які — ціхо-о-оня. Куды завярнуў, — закаціла яна чарнюткія свае вочы. — А ўсё-такі праўду кажуць, што ў ціхім балоце ды чэрці водзяцца. Ідзі ўжо, жа-а-аніх.

Пасля таго вечара мы пачалі сустракацца часта. Гэты небам пасланы каўнер быццам бы зрадніў нас. Ёй, мусіць, няёмка было адмаўляцца ад маёй кампаніі (хоць я на два з паловай гады маладзейшы за Ярыну), а можа, як яна і цяпер яшчэ мне даказвае, наадварот, сустрэча са мной заўсёды была жаданай для яе, і ў рэшце рэшт мы пажаніліся. Перад самым маім адыходам на службу.

Цяпер у нас трое дарослых дзяцей і ўнукі. Мы ні разу за ўсё сумеснае жыццё не пасварыліся (паспрабавалі б вы ў чым-небудзь з ёю не пагадзіцца, я тады з вас пасмяяўся б), а каўнер той з «чорнай вавёркі» і цяпер яшчэ тлее паціху ў цыратовым мяшочку. Рэліквія.

Ну, а Мікола Сымонькаў — загадчык бойні ў нарыхтоўчай канторы, мусіць, і да гэтага часу думае, што я нічога не ведаю пра яго фокус-марокус. А мо і забыўся ўжо — колькі ж гадкоў мінула. Толькі я не крыўдую. Я ўдзячны яму, і вы ведаеце, за што. Можа, прачытае калі гэтыя радкі, дык няхай ведае — дараваў я яму той грэх.

Разграфаваны сшытак у белай вокладцы

З Веранікай, даўняй сваёй знаёмай, я сустрэўся зусім неспадзеўкі. Адразу мы і не пазналі адно аднаго. І не дзіва — столькі гадоў мінула. Апошні раз школьнікамі бачыліся. Да таго ж я быў на добрым падпітку, а яна гэтак начапурылася, што і маці родная прайшла б побач, не прыкмеціўшы сваёй крывінкі.

...Адбылося ж усё вось пры якіх абставінах. Неяк у рэстаране мы з сябрукамі ладзілі вечарынку, адзначалі невялічкім гуртам Дзень друку, бо ўсе былі работнікамі пяра. Працавалі хто ў газеце, хто ў часопісе ці выдавецтве. Заказалі пару пляшак гарэлкі, дадалі да яе прынесеную з сабою і, як гэта водзіцца ў нашага брата, развялі за сталом такія дэбаты, гэтак ухапілі за чупрыну яе вялікасць палітыку, а заадно і філасофію, быццам бы не на свята сабраліся, а на вучоны савет. Часам і я ўстаўляў свае пяць капеек, але ўліцца ў агульную плынь гутаркі так і не здолеў, засумаваў і вырашыў выскачыць на вуліцу, падыхаць свежым паветрам, бо над нашымі бутэлькамі і пузатым графінам, скамечанымі папяровымі сурвэткамі і паўпустымі талеркамі з мясам, косткамі і капустаю пад маянэзам ужо вісеў сапраўдны смог ад цыгарэтнага дыму, за якім губляліся, расплываліся, цямнелі твары суразмоўцаў.

Спусціўшыся па гулкай прасторнай лесвіцы ў аздобленае каляровай мазаікай фае, адчыніў масіўныя высачэзныя дзверы і... аказаўся сведкам, а хутка і ўдзельнікам не вельмі прыемнай сцэны: двое міліцыянтаў праганялі ад рэстарана маладую жанчыну ў залішне кідкай апратцы і з не меней кідкімі, аголенымі нагамі, а тая даводзіла ім, што зараз выйдзе яе муж і толькі разам з ім яна пойдзе дахаты.

Я толькі паспеў прычыніць за сабою масіўныя дзверы, як апынуўся ў самым цэнтры разборак.

— Ну, я ж казала вам — зараз паявіцца мой муж. Во ён, яшчэ цёпленькі. Калі хочаце, пазнаёмцеся, а лепей не трэба.

І незнаёмка ўпэўнена скіравала да мяне, схапіла за рукаў, падміргнула праз вялізныя шкельцы акуляраў тлуста «наваксаванымі» вейкамі:

— Во, пайшоў і прапаў. Хадзем дахаты, пакуль не насцябаўся зусім. Ты ж абяцаў, што не затрымаешся доўга. Апранайся ды пойдзем.

Па натуры я чалавек вельмі добры, ды і кемлівасці хапіла, каб разабрацца, што тут і да чаго. Таму без асаблівых разваг згадзіўся пабыць на якую хвіліну яе мужам.

— Мілачка, ну як жа я пакіну сваіх сяброў. Хоць бы з паўгадзінкі яшчэ. Няёмка пакідаць іх. Не так ужо часта і сустракаемся.

— Дык што мне, стаяць і чакаць тут, пакуль ты наліжашся? — жанчына раздражнёна сціснула вусны.

— Давай тады да нас. Пасядзім і пойдзем.

Міліцыянты падазрона зыркалі на нас з-пад чорных казыркоў, але падысці і праверыць нашае сваяцтва ўсё ж не рашаліся. Я ўзяў незнаёмку пад руку і павёў наверх да нашага шумнага століка ў асобнай каморцы.

— Шаноўныя, дазвольце мне пазнаёміць вас са сваёй дваюраднай жонкай і кідайце дурныя спрэчкі, — звярнуўся я да калег, спыніўшы тым самым застольны гармідар. А тыя ажно раты параскрывалі, калі ўбачылі мяне вось у такім суправаджэнні, бо добра ведалі маё стаўленне да сям'і.

— Ого, — выдыхнуў адзін.

— Андрэй пайшоў юзам, — заспяваў другі.

— У мяне нешта са зрокам,— паспрабаваў пакпіць трэці летапісец.

І сябрукі дружна пацягнулі рукі для знаёмства з госцяй, устаючы, каб прадставіцца.

— Вераніка. Вельмі прыемна. Вераніка... — яна называла сваё імя і дазваляла цалаваць маленькія выпешчаныя пальчыкі.

«Вераніка?»

Я ўспомніў яе. «Далібог. Гэта ж яна — мая Вераніка». Той жа невялічкі кірпаценькі носік, шчылінка паміж верхнімі пярэднімі зубамі, вялікі, ды вельмі сімпатычны, прываблівы рот. Толькі валасы не яе. Фарбаваныя і перафарбаваныя, мусіць, сто разоў, яны цяпер мелі дзіўны дымчата-фіялетавы колер.

— Вераніка!

Я, відаць, крыкнуў занадта гучна, бо сябрукі вылупілі на мяне вочы і зноў узяліся за кпіны:

— Чаго горла дзярэш?

— Ці то я пачуў голас з унітаза?

— Зусім здурнеў, заікамі хоча зрабіць нас.

А мая даўно знаёмая незнаёмка агледзела мяне доўгім позіркам і ніяк не адрэагавала на зварот. Але ж у мяне выдатная памяць на твары. Я іх, можна сказаць, фатаграфую. Я паўтарыў яе імя, толькі ўжо цішэй.

— Андрэй?

— Не, мусіць, не Андрэй.

— Андрэйка, ты? Няўжо? Колькі ж мы з табою не бачыліся. Ты стаў такі салідны і вунь працоўны мазоль на жываце выгадаваў.

— Вераніка. Мы не бачыліся... Гм... Ды што там лічыць — цэлую вечнасць не бачыліся. Вось дык сустрэча. Расказаць каму — не паверацъ.

Сябрукі, ледзь не страціўшы прытомнасць ад такога развіцця падзей, адно круцілі галовамі ды лыпалі няўцямнымі вачыма. Але хутка ажывіліся, загаманілі, нават спрабавалі пажартаваць.

— А мы, Андрэй, верым. І таму прапануваем выпіць за гэтую сустрэчу. Садзіцеся вось тут — разам. Васёк, налівай.

Васёк наліў і падняў чарку.

— Давайце вып'ем ведаеце за што? Зараз скажу. Вось прывядзеш ты, Андрэй, сваю прыўкрасную Вераніку дахаты, пакладзеш у ложак, а калі жонка спытае, што ўсё гэта значыць, адкажаш ёй так. Ішоў, маўляў, па горадзе і ўбачыў жабу пад сцяною дома. Хацеў прайсці міма, а яна і просіцца: «Вазьмі мяне, Андрэйка, ды пакладзі ў кішэню». Так і зрабіў. Прынёс дамоў, а яна зноў: «Пакладзі мяне, Андрэйка, у ложак, а то замёрзла». Паклаў. «Ляж са мною». Выканаў просьбу. І тут жаба ператвараецца ў такую вось прыгажуню. Уразумелі? Дык давайце вып'ем за тое, каб жонка паверыла такой вось казцы, а заадно і каб усе нашыя жанкі такім казкам верылі.

Дружна зарагатаўшы, усе выпілі, запілі фантай, і над сталом запанавала храбусценне пасечанай капусты.

Наступныя два тосты таксама прысвячаліся мілавіднай госці, і ў перапынку паміж выпіўкамі яна зноў была ў цэнтры ўвагі. Ну, а пасля філосафы-палітыкі-пісакі вярнуліся да сваіх бясконцых спрэчак і не чапляліся больш да мяне і Веранікі. Яны ўспомнілі пра Сяргея, які некалі быў у іхнім гурце.

— Эх, быў бы з намі Сяргей, такую эпіграму забацаў бы...

— Або спяваў бы ўжо арыю з оперы.

— А хто вінаваты, Сцяпан, што яго няма за гэтым сталом?

— Ніхто не вінаваты. Проста так сталася.

— Няпраўда, Сцяпан. Ты баішся прызнацца, што вінаваты ўсе мы. Ніхто з нас не хацеў...

...Пакуль яны высвятлялі, хто ўсё ж вінаваты, а хто не, я паспеў расказацьь Вераніцы, чаму мы тут, і нават дзе-што патлумачыў наконт нашых адносін:

— Сяргей працаваў са мною ў газеце. Але нікому не падпарадкоўваўся дый... за каўнер закідаў. За гэта і звольнілі. Цяпер зусім запіў. Я сябраваў з ім. Але ён не прызнаваў маіх сяброў. Тыя ж папракалі мяне за сяброўства з Сяргеем. Тады я зрабіў глупства — парваў з імі, перайшоў у ягоны гурт. І сяджу во як не свой, бо тое, пра што яны балбочуць, мяне зусім не цікавіць.

Я змоўк, і ўсчатая спрэчка зноў завалодала нашым слыхам.

— ...Гэта ты вышукваеш у смецці залатыя зярняткі.

— І знаходжу іх. Ты хоць ведаеш, з кім ён цяпер?

— З такімі ж наркотамі, як і сам.

— Калі ў нашай краіне яшчэ не зніклі апошнія ачагі чыстага сумлення ды сапраўднага сяброўства, дык яны засталіся хіба што ў асяроддзі вось такіх, як ты кажаш, наркотаў.

— Ну-ну-ну... Дагаварыўся. Далей ужо няма куды. Нам толькі не хапала на п'яніц маліцца. Ды твой «святы» нас за людзей не лічыць, разумнік гэткі. Будзь ён тут, даўно ўжо нас з граззю змяшаў бы. У кожным знайшоў бы шчэпку ў воку, а ў сваім бервяна не бачыць.

— Ён калі і змешваў нас з гразззю, дык не з чыёй-небудзь, а з нашаю, якой нам не пазычаць...

Мы крыху паслухалі яшчэ, але хутка зразумелі, што канца дурной спрэчцы не будзе, і загаманілі пра сваё, закідваючы адно аднаго пытаннямі. Праўда, Вераніка яшчэ паспела, перш чым мы поўнасцю адасобіліся ад кампаніі, кінуць колькі слоў у гэтае месіва абвінавачванняў. Глыбакадумна зацягнулася цыгарэткаю, эфектна прыцерусіла попелам абгрызеныя костачкі ў талерцы, пасля не то для сябе адной, не то і для мяне таксама сказала:

— Чаго яны дабіваюцца адзін ад другога? Усё адно ж не знойдуць ісціны. Бо сама спрэчка — гэта і ёсць ісціна, бо жыццё — гэта суцэльная супярэчлівасць, няхай сабе і жыццё аднаго чалавека.

Такім чынам Вераніка разбіла ўсе довады «пракурораў» і «адвакатаў» і зрабіла спрэчку пустой і непатрэбнай. Я ж ад гэтых слоў устрапянуўся, адчуўшы, што маю справу зусім не з тою гарэзай-дзесяцікласніцай, з якою да самазабыцця цалаваўся больш чым дваццаць год таму ў хвойніку паміж яе і маёй вёсачкамі. Поруч са мной сядзела, выставіўшы кругленькае крамянае каленца, занадта сур'ёзная, нават, падалося, суровая жанчына, якая, магчыма, перанесла нямала душэўных выпрабаванняў. У гэты момант яна выглядала чужою не тое што ў нашай кампаніі, але і наогул у чалавечым жыцці — такім дробязным і нікчэмным. Пад яе пранізлівым позіркам я пачуваў сябе не вартым увагі мурашком. Уважлівей прыгледзеўшыся да сваёй даўняй знаёмай, я знайшоў, што ўся гэтая кідкая апратка, якую яна нацягнула на сябе, — звычайны маскарад. Ні чырвоная кароценькая спаднічка, ні пушысты, вельмі багаты з выгляду пярэсценькі пуловер, ні доўгія бліскучыя кліпсы зусім не пасавалі ёй, бо тое, што было патрэбна ёй, — гэта шэры касцюм з якім-небудзь някідкім маленькім упрыгожаннем на лацкане пінжака і гэткая ж строгая (для дзелавой жанчыны) прычоска.

Мае развагі, відаць, занялі шмат часу. Вераніцы надакучыла выпрабоўваць на сабе мой хутчэй задубелы, чым задуменны, пагляд, і яна падхапілася, падсунулася бліжэй і зазірнула мне ў вочы:

— Ты хоць калі-небудзь успамінаў пра мяне?

— А ты?

— Божачкі, Андрэй, ты зусім не змяніўся. Ты як быў маўчуном, так ім і застаўся. Гаварыць не любіш, затое гатовы бясконца слухаць і слухаць... Помніш, калі ты праводзіў мяне дахаты і мы садзіліся на лаўку пад парканам, дык заўсёды не знаходзілі пра што пагаварыць. І ты плёў мне дурныя анекдоты, бо далей нашае маўчанне нельга было трываць.

— Помню, Вераніка. Я тады вельмі дакараў сябе за сваю маўклівасць. Баяўся, што стану табе нецікавы, што абрыдну табе і мы расстанемся. Мусіць, я кахаў цябе.

— А цяпер?

— А што цяпер. Цяпер у мяне ёсць жонка, трое дзяцей. Я іх вельмі люблю. Сям'я для мяне — святое. Дый хіба ў такім узросце гавораць пра каханне? Глупства.

Вераніка капнула сабе трошачкі «Рускай», паставіла на месца маленькі кругленькі графінчык. Сябры заўважылі гэта і накінуліся на мяне:

— Ты што, не можаш прыслужыць даме?— Сцяпан хутчэй узяўся падкладваць у яе талерку салату, мяса.

— Кавалер саплівы. Давай разлівай, вып'ем разам з госцяй.

Я моўчкі напоўніў шкляначкі, даліў Вераніцы, спустошыўшы графін.

— Дзеля такой сустрэчы трэба было б яшчэ заказаць якую мачынку. А то нейкі сціплы прыём атрымліваецца, — падаў голас Васіль, які бутэльку заўсёды называў мачынкай. Калі хто заходзіў да яго ў госці, ён заўсёды прапаноўваў: «Ну што, па мачынцы?»

Я запытальна паглядзеў на Вераніку.

— Не, болей піць не буду. Я і так вельмі ўдзячна вам за такі прыём.

— Ну, тады з Богам. За сустрэчу.

Мы выпілі, але ад выпітага я не п'янеў, а, здавалася, толькі цверазеў. І ўсё прымушаў Вераніку добра закусваць. Тая ж для выгляду пакорпалася відэльцам у сваёй талерцы, а пасля, крыху аб нечым падумаўшы, нахілілася да мяне і шапнула:

— Мне пара...

— Дзе ты жывеш? Далёка? Я правяду. — Я таксама перайшоў на шэпт і ўжо выціраў сурвэткаю рукі, рыхтуючыся пакінуць наседжанае месца.

— Хіба так важна, дзе я жыву? Няўжо, калі далёка, дык не захочаш правесці?

— Не-не, што ты.

— Дзякую. Ты не забавішся. Да майго дома — адзін аўтобусны прыпынак.

— І гэты шлях мы пройдзем пешшу.

— Так, пройдзем пешшу.

* * *

— Ведаеш, Вераніка, а я нядаўна праязджаў тою дарогаю, па якой праводзіў цябе тымі даўнімі вечарамі-начамі дахаты. Ехаў, і нічога асаблівага, надзвычайнага ў тым лесе не прыкмячаў. Нават не пазнаў спярша, пакуль не агледзеўся і не вызначыў дакладна месцазнаходжанне аўтобуса. А тады мне ўсё здавалася надзвычайным: і тое, што ў лесе было шмат варання, якое ад майго свісту ўздымалася ў фіялетавае вячэрняе неба і рабіла яго чорным, а цябе палохала, і тое, што на дарозе было шмат пяску, таму ты здымала туфелькі, ішла басанож. Цяпер там — асфальт і няма крумкачоў. Быццам бы нехта знарок гэтак усё зруйнаваў, каб не пакінуць і напаміну пра нашае шчасце. Няхай сабе тое і не было каханнем, але ж нам было добра, мы пачувалі сябе як у сне, як у прыемным, цёплым, лагодным сне.

— Ты ўсё такі ж рамантык, як і быў. І пісака-фантазёр. Гаворыш, быццам раман палюбоўны чытаеш. Хаця, Андрэй, усё ты правільна сказаў. Усё так, і я гатова падпісацца пад кожным тваім словам, хоць ужо запамятавала і крумкачоў, і пясок на дарозе.

Гэтак мы гутарылі, седзячы ўжо ва ўтульным пакойчыку (утульнасць гэтая як бы падкрэслівала, што тут жыве адзінокая жанчына) яе досыць багатай двухпакаёвай кватэры. У руках нашых дыміліся напоўненыя каваю маленькія фарфоравыя пасудзіны ад «Мадонны», з якіх мы няспешна адсёрбвалі, седзячы адно насупраць аднаго. Паміж намі на журнальным століку ляжалі каля крыштальнай папяльнічкі цыгарэты ў размаляваным пад амерыканскі сцяг пачку, некалькі брыкецікаў шакаладу, сурвэткі з выявамі ці то нямецкіх, ці швейцарскіх будынкаў з чырвонымі дахамі.

— Можа, мы і ў мяне чаго вып'ем?

— Дзякуй, але мне хутка ісці. Дома ж чакаюць, хвалююцца. Дый нашто траціцца ўпустую.

— О-о, пра гэта не клапаціся. Мой заробак дазваляе мне купляць штодня па дзве-тры бутэлькі шампанскага, і гэта ніяк не адбіваецца на маім бюджэце.

— Ты многа зарабляеш?

— Нямала.

— А чым займаешся?

— Маю прафесію ты неаднойчы абліваў брудам у газетах.

— Найбольш чытацкі інтарэс выклікалі мае публікацыі аб праблемах прастытуцыі, але ж...

— Але ж што? Цябе здзіўляе мая сённяшняя прафесія?

Я з асаблівай выразнасцю зірнуў на яе кругленькае вабнае каленца, якое зманліва вызірала з-за століка, быццам бы паказваючы сваім позіркам, што цяпер мне стаў зразумелы яе выгляд...

Вераніка не зніякавела. Яна толькі паставіла пасудзіну з каваю на сурвэтку — прама на акно намаляванага будынка, размашыстым рухам паднесла да матавых вуснаў цыгарку і чыркнула запальнічкай.

Не сказаць, каб гэтая наколькі знаёмая, настолькі і незнаёмая жанчына цяпер, калі ўва мне даўно перагарэла тое юначае пачуццё, зусім не вабіла да сябе. Але я адчуваў, што стрымацца ад спакусы прытуліцца да гэтага рухавага гарачага цела будзе няцяжка. «Нават калі б яна зараз падышла да мяне ззаду і пачала песціць, я не паддаўся б». I зусім не таму, што Вераніка была не здольная ўзбудзіць мяне (усё якраз наадварот). Проста за пятнаццаць год свайго сямейнага жыцця я ні разу не здрадзіў жонцы, і гэтая мая сямейнасць (падкрэсленая, дарэчы, і гараскопам), павага да хатняга акружэння ўвайшлі ў маю кроў — трывала, назаўсёды.

Праўда, Вераніка і не прадпрымала нічога для таго, каб справакаваць мяне на блізкасць.

— Я чытала твае артыкулы «...У гатэль уварваліся аўтаматчыкі», «Целам гандляваць — не зямлю араць», «Да рынку — з голым задам». У іх мяне нічога не здзівіла, акрамя тваёй нецярпімасці...

Вераніка скамячыла ў попельніцы акурак, адкінулася на мяккую спінку крэсла, склала на грудзях рукі.

— У мяне тут вось якая думка наспела. Хачу прапанаваць табе цудоўнейшую тэму для чарговага артыкула. Ён павінен па ступені папулярнасці перакрыць усе, што былі напісаны раней... А шампанскага мы ўсё ж вып'ем. Усё роўна я затрымаю цябе на якія паўгадзіны.

І Вераніка борздзенька залапатала ўступцамі да сценкі, адчыніла бар, выбрала сярод мноства бутэлек адну, паставіла разам з крыштальнымі філіжанкамі на столік.

— Адкрывай.

З шакаладам шампанскае паказала мякка-салодкі смак.

— Ты ж, наколькі я памятаю, гэтак, як да прастытутак, нецярпімы і да камуністаў?

— І гэтаму ёсць прычыны.

— Няхай сабе. У такім выпадку я для цябе проста знаходка. Ты толькі ўяві сабе: былы адказны работнік крайкома партыі...

— Ты гаворыш пра сябе?

— Я працавала сакратаром па ідэалогіі...

— Ну і ну-у?

— Не перапыняй больш. Я працягваю. Уяві сабе: былы адказны работнік крайкома партыі становіцца прастытуткай. Памятаеш, ты не так даўно называў партыйцаў гэтым словам... Ну, у пераносным сэнсе. Памятаеш?

— Так, помню.

— Дык цяпер у цябе ёсць магчымасць абысціся без параўнанняў. Перад табою — самы што ні ёсць партыйны бюракрат, які ператварыўся ў сапраўдную прастытутку. Ты пачнеш свой артыкул так: «Шаноўныя мае чытачы (ты ж іх любіш, шануеш, ці не так?). Тое, што я вам скажу зараз, магчыма, шакіруе вас. Справа ў тым, што зусім нядаўна я сустрэўся з адной прастытуткай, якая, як пасля высветлілася, у часы камуністычнага праўлення кіравала, вазьміце гэта пад увагу, ідэалогіяй цэлага краю. Вы здзівіліся гэтаму паведамленню? Дарэмна. Асабіста я іншым словам іх ніколі называць не мог. Нарэшце паказалі сапраўднае сваё аблічча...»

Я хацеў даць ёй выказацца да канца, але не стрываў:

— Не блазнуй. Пра каго іншага я, магчыма, і напісаў бы так (дарэчы, ты вельмі добра засвоіла мой стыль). Але пра цябе... Гэта было б злачынствам.

— Нічога ты не зразумеў, інжынерышка чалавечых душ. Не пра сябе ж гавару. Я бяру ў прынцыпе.

— Ты хочаш сказаць, што я не справядлівы да тых, каго крытыкую ў сваіх артыкулах? — Я адштурхнуў нагою пярэстага ката, што безупынку цёрся аб калашыну, і нахіліўся, каб скінуць варсінкі.

— Ды не, нічога такога я табе сказаць не хачу. Проста распавяду дзе-што пра сябе.

— Прабач, Вераніка, але ж першая гадзіна ночы. Мне даўно пара дахаты. Хіба мы другім разам не зможам завяршыць гэтую гутарку?

— Не, другім разам будзе не той эфект. Дазволь мне затрымаць цябе яшчэ на адну гадзіну.

— Добра, слухаю. — Я закінуў нагу за нагу, абхапіў рукамі калена і ўжо сядзеў як на іголках.

* * *

«...Веранічка, пакажы гэтым лайдакам, як трэба адказваць на ўроку. Малайчына. Выдатна...

...Веранічка, захварэла настаўніца нямецкай мовы. А ты ж у нас выдатніца, напэўна, вывучыла ўсё наперад. Правядзі колькі ўрокаў. Нічога, што вучаніца. У цябе атрымаецца. З хіміяй жа справілася. Вось і слаўненька...

...Слова мае выдатніца вучобы, член бюро райкома камсамола Вераніка Ламейка...

...Прыемна, што сярод выпускнікоў нашай школы ёсць і залаты медаліст. Гэта, як вы, напэўна, здагадаліся, Вераніка Ламейка...

...У апараце райкома партыі мы таксама абмяркоўвалі кандыдатуру Ламейка і прыйшлі да вываду, што, заняўшы пасаду першага сакратара райкома камсамола, яна здолее ўзняць работу раённай камсамольскай арганізацыі на належны ўзровень... Хто за? Аднагалосна...

...Мяркуем, гады працы ў райкоме камсамола не прайшлі дарэмна для Веранікі Максімаўны. Яна набралася вопыту, пасталела і, да ўсяго, паказала выдатныя арганізатарскія здольнасці. Настаў час падумаць і пра далейшую кар'еру. Прапаноўваем табе пасаду сакратара па ідэалогіі райкома партыі. Як лічыш — справішся? Вось і малайчына. Мы таксама не сумняваемся...»

— А ты... Ты зведаў гэтую хваробу?

— Ты маеш на ўвазе хваробу росту?

— Не зусім росту. Хваробу імклівага ўзлёту. Быццам бы ты разагнаўся і не ведаеш, як спыніцца. І не хочаш спыняцца. Ляціш сабе, бяжыш, імчыш па інерцыі, і ўвесь захоплены гэтым бегам, і нічога больш для цябе не існуе, акрамя асалоды руху.

— Не, мяне такая хвароба мінула. Пасля журфака я атрымаў накіраванне ў моладзевую газету... Там і працую.

— Здаецца, мы сябравалі з табою адзін год. Пасля я і матка ўцяклі ад бацькі далёка-далёка — ехалі некалькі сутак цягніком... А ты падаўся на вучобу. Там я пайшла ў дзевяты клас. Я была вясковаю з дня нараджэння, але зусім не ведала, што такое сялянская праца. Захваленую выдатніцу маці баялася прымушаць рабіць што-небудзь

па гаспадарцы. «Ты ўжо вучы лепш свае ўрокі, я і сама тыя грады пасаджу. Вучыся, дык не будзеш пасля пакутаваць, як твая маці». Калі яна ішла на працу (відаць, там было шмат клопатаў, бо вярталася яна з заходам сонца), я даставала з партфеля дзённік і доўга любавалася ягоным змесцівам: пагладжвала пальцамі круглыя, як каўшы, або размашыстыя, акуратныя ці нязграбныя пяцёркі. Іх колькасць была для мяне тое самае, што для філатэліста колькасць рэдкіх марак. Пасля я гэтак жа любавалася сваімі сшыткамі, у якіх не магло быць ніводнай памылкі. Толькі роўны, як у кнізе па чыстапісанні для пачатковых класаў, почырк і чырвоныя коўшыкі пяцёрак. З сёмага класа я завяла яшчэ адзін дзённік (бачыла такі ў старэйшай сяброўкі. Там запісваліся пажаданні знаёмых, песні, якія ёй падабаліся, шмат выслоўяў пра каханне і нешта яшчэ, размаляванае каляровымі фламастэрамі). Гэта быў абгорнуты белаю скураною вокладкаю тоўсты агульны сшытак, кожную старонку якога я акуратна разграфавала з дапамогай лінейкі і чырвонай пасты, каб пасля запаўняць тыя графы прыкладна такою дурнотаю:

«1 верасня 1969 года. Мяне папрасілі выступіць на свяце першага ўрока ў райцэнтры. Гаварыла без паперкі. Калі скончыла, загадчыца райана, якая стаяла ззаду, некаму шапнула: «Вельмі, вельмі разумная дзяўчына. Звярніце на яе ўвагу...»

2 верасня 1969 года. Выкладчыца гісторыі, яна ж дырэктар школы (слова ДЫРЭКТАР я якуратна, пад лінеечку, падкрэсліла), сказала: «А зараз я хацела б даведацца, што вы памятаеце з пройдзенага намі ў мінулым навучальным годзе. Але я баюся, каб вы не сапсавалі мне першы ўрок. Я хацела б хоць сёння мець добры настрой, і таму выклікаю да дошкі Вераніку Ламейка...»

3 верасня 1969 года. Верачка, мы просім цябе ўзяць шэфства над адстаючымі вучнямі твайго класа...

26 студзеня 1970 года. У мяне закахаўся самы прыгожы вучань з 9 класа Андрэй К., з якім за шчасце палічыла б сябраваць любая дзяўчына школы. Ён таксама выдатнік і друкуецца ў газетах...

8 красавіка 1970 года. Маці сказала: «Веранічка мая, і ў каго ж ты такая разумненькая ўдалася. Матка ж твая дурніца з дурніц, а бацька і зусім п'яніца...»

— Чакай. Я хачу вярнуцца да папярэдняга запісу. Хіба ты магла напісаць такое пра мяне? Ты ж кахала мяне. Кахала, так?

— Гэта яшчэ дробязі. Паслухай, што я працытую далей.

«...На ўроку ваеннай падрыхтоўкі праходзілі стральбу. Я адстралялася горш за ўсіх. Тады ваенрук заявіў, што паставіць мне адзнаку «добра», і не болей. Я пачала пярэчыць, маўляў, тое, як я

страляю, не павінна ўплываць на адзнаку. Галоўнае — я добра ведаю дысцыпліну. Ён зараз жа задаў некалькі пытанняў, і я заблыталася ў іх, бо была занадта ўзбуджаная: мяне вельмі страшыла, што ў маім бездакорным дзённіку можа з'явіцца цёмная пляма. Калі ён папрасіў дзённік, я паглядзела на яго гэтак жаласліва, што пусціў бы слязу і камень, і прашаптала: не магу, вельмі вас прашу. Ён лагодна ўсміхнуўся (так лагодна, як можа ўсміхацца забойца, стоячы над сваёй ахвярай) і прапанаваў застацца ў ціры пасля ўрокаў, каб трошачкі патрэніравацца. Але мы не трэніраваліся...»

— Вераніка, я не веру табе. Ты была сапраўдным анёлам. Я не хачу, каб ты расказвала мне пра гэта.

— Не, я буду працягваць. У нас не дайшло да ГЭТАГА...

«...Ён папрасіў мяне распрануцца, але я ўся дрыжэла ад страху і не магла скрануцца з месца. А гэты паскудны чалавек, які падобны быў на кій, і калі ішоў, то здавалася, што ў яго хранічны радыкуліт, супакоіў мяне: я не зачаплю цябе, я хачу толькі палюбавацца табою. І я зрабіла, як ён прасіў. Каб ты бачыў, як ён захапляўся маім целам, як цалаваў мае ногі, бёдры і жывот. Не скажу, што гэта было прыемна мне, але перад вачыма маімі ўсплыло самае галоўнае: уціснутая ў клетачку дзённіка дробненькая пяцёрка і сшытак у белай вокладцы, у якім наступны запіс будзе гэткім жа прыемным, як і папярэднія...»

— Гэты запіс у цябе атрымаўся вельмі доўгі. Але ты забыла назваць дату, калі ён рабіўся.

— Гэты запіс захаваўся толькі ў маёй памяці. У сшытку ён выглядаў бы занадта пачварна. А яго ж разграфаваныя лісты былі маім жыццём. Я сама ператварылася ў гэты сшытак.

— Ты падманвала сябе.

— Магчыма. Але так было.

— Са мною ты таксама цалавалася дзеля запісу ў сшытку?

— Гэта пытанне-папрок?

— Не, я задаў яго з цікаўнасці.

— Тады адкажу. Не варта скідваць з рахунку, што я ўсё ж была дзяўчынаю. І дзяўчынаю дарослай. Я нават пачувала сябе жанчынай, і з табою зусім забывалася на сваю хваробу. Яна мяне ненадоўга адпускала. Але ў рэшце рэшт мне наканавана было так і застацца разграфаваным сшыткам. Хочаш, я пакажу табе свой адбітак?..

Не чакаючы адказу, яна падхапілася, скіравала да кніжнай шафы, і я ўбачыў перад сабою зусім не тое, чым любаваўся колькі гадзін таму. Гэта была постаць няшчаснай, стомленай жанчыны. І я падумаў: гэтая хвароба ўсё ж даканала яе.

Не, яна не горбілася. Але рухалася так, нібы наперадзе стаяла гільяціна і ёй трэба горда пакласці на яе сваю галаву. Горда і толькі горда, каб не выклікаць жаласлівасць у некага з тых, хто з прыкрасцю сочыць за кожным яе рухам. Здаецца, ззаду, з бакоў жанчыну акружылі вясковыя бабкі-балбатухі і скрушна ківаюць галовамі: «Хто б мог падумаць, хто б мог падумаць. Які жах, які жах. Жыві проста, кажуць, пражывеш год да ста. Не хоча «проста», не хоча».

Шафа была вялізная і са шклянымі дзвярыма, за якімі я знайшоў вачыма чорныя вокладкі Поўнага збору твораў Леніна і мноства бліскучых, яркіх пераплётаў. Можа, гэта былі кнігі з серыі эратычных бестселераў. А калі адчыніліся ніжнія непразрыстыя дзверцы, увагу прыцягнулі цэлыя стосы тонкіх і агульных сшыткаў. Напэўна, сярод іх ляжалі і вучнёўскія дзённікі. Вераніка ўзяла самы верхні, абцягнуты бялюткаю штучнаю скураю. Выглядаў ён як новы: чысценькі і акуратны.

Я падхапіў яго з вялікай асцярожнасцю. Адчуваў — я першы пасля Веранікі, хто гартае гэтыя пазначаныя чужою таямніцаю старонкі. Большая палова іх аказалася спісаная раўнюткім курсівам і разграфаванымі на тры гарызантальныя паловы: першая — дата, другая — асноўны запіс і трэцяя, самая вузкая (прыкладна два-тры сантыметры шырынёй) аддзяляла чыстае поле. Почырк на першай і апошняй старонцы мала чым адрозніваўся. Можа, з часам ён стаў хіба толькі болей размашысты.

— Каб не займаць лішнія хвіліны, я пакажу табе той запіс, дзеля якога ўзяла гэты сшытак. Вось ён.

І яе бліскучы чаўнок-пазногаць спыніўся на даце: 7 снежня 1988 года.

«Сёння я дакладна ведаю, што павышэння мне давядзецца чакаць зусім не доўга. Не пройдзе і трох месяцаў, як кабінет, на дзвярах якога цяпер вісіць бліскучая ромбападобная шыльда з надпісам: «Сакратар крайкома т. Няфёдаў А.К.» будзе маім. Гэтай ноччу я абагнала сваіх праціўнікаў. Я паланіла якраз таго чалавека, ад якога ўсё залежыць. Цяпер ён мой і толькі мой. Ён сто разоў назваў мяне самаю прыемнаю, самаю мілаю, самаю разумнаю і самаю цнатлівай. Да яго мяне не зведаў ніводны мужчына...»

Вераніка насцярожана сядзела насупраць і пільна сачыла за мною праз вялізныя шыбіны акуляраў. Чакала рэакцыі. Чакала, што вось-вось мае вусны скрывяцца ў пагардзе, быццам я ўкусіў недаспелую антонаўку і «ўбачыў Маскву», каб сустрэць мой здзеклівы пагляд непакорліваю ўсмешкаю. Але я не скрывіўся. Я чамусьці закрыў сшытак, яшчэ раз уважліва агледзеў яго і, не знайшоўшы, за

што зачапіцца, зноў адкрыў, хуценька прагартаў старонкі, дабраўся да апошняга запісу.

«8 сакавіка 1991 года. Чалавек, якога я не хачу называць сваім палюбоўнікам, бо зусім абыякавая да яго, падарыў мне цэлае вядро ружаў. Ён абагаўляе мяне».

Цяпер я сапраўды вельмі ўважліва зірнуў на яе. Але гэта быў не позірк-пагарда, а позірк-здзіўленне.

— Вераніка, гэты запіс ні пра што не гаворыць. Чаму ты палічыла, што ён павінен быць апошнім?

— Таму што толькі ў вас, журналістаў, кожны артыкул мае лагічнае завяршэнне.

Куточкі яе перламутравых вуснаў ледзь прыкметна задрыжалі. Пагляд стаў жорсткі, ад чаго, здавалася, выпраміўся маленькі кірпаценькі носік (мусіць, яна не ўмела плакаць). І гэты занадта афіцыйны выраз твару яшчэ больш не пасаваў да яе кідкага мякка-пяшчотнага пуловера і адкрытых каленак.

— Калі табе гэтак цікава, я прадоўжу вусна. Як ты зразумеў, я напісала пра чалавека, якога згадвала 7 снежня. У той дзень ён гаварыў са мною не пра кар'еру, а пра палітыку. Але я не слухала яго, бо апошняе мяне зусім не цікавіла. Затое я добра запомніла іншае. Ён казаў: «Ты шмат чаго не ведаеш з таго, што ведаю я. Дык вось ведай: у нашай справе ніякіх думак пра кар'еру болей быць не можа. Усё. Пакуль не надышоў апошні дзень, трэба вызначацца, што рабіць. Я вызначыўся. Сёння мы сустракаемся з немцамі, будзем прасіць у іх дапамогі. Гэта будзе ў рэстаране. Калі ты не супраць, мы можам схадзіць туды разам...» Тады я спытала: «Што ж мне рабіць?» А ён адказаў: «Будзе лепей, калі ты пойдзеш са мною. І табе, і мне. Праветрышся... Усё разрадка нейкая. А мне, можа, прасцей будзе дамаўляцца з імі...» Я папраўілася: «Што мне рабіць увогуле? Як жыць далей?» — «Не ведаю. Ва ўсялякім разе ў адным я не сумняваюся ніколечкі: прастытуткаю ты не станеш». — «Чаму ты ўспомніў гэтае слова?» Мяне яно вельмі ўразіла і нават раззлавала. «Прабач. Проста вырвалася».

— Вось такі працяг мог паявіцца ў сшытку. Але ён не ўвасобіўся ў літары, бо сшытак мой не для такіх запісаў. Ён не прымае іх, — і Вераніка акунула ў попел гарачую галаву цыгарэты, прыдушыла яе ўказальным пальцам, націснуўшы так, што востры пазногаць шкрабянуў па гладкім дне попельнічкі. Зняла левую рукою акуляры, а праваю сціснула скроні, слізганула пальцамі па вачах, быццам імкнучыся выдавіць іх, спыніла ўказальны і вялікі на пераноссі. Пад вокам з'явіўся доўгі вузкі сіняк. Гэта ад попелу, што прыліп да ўказальнага

пальца і забіўся пад пазногаць. Цяпер як бы яна ні намагалася трымацца горда і незалежна, сіняк зводзіў на нішто тыя высілкі. Ён канчаткова выдаваў яе, усё адно як на гэтым месцы нехта выразна напісаў: «Бездапаможная, зусім бездапаможная».

— А ты? Ты прымаеш такія запісы?

— Як бачыш. Сшытак, мусіць, аказаўся толькі часткаю мяне.

— Што ж было далей?

— Далей мой сшытак перастаў прымаць што б там ні было. І перамогі...

— А яны былі?

— Я раскажу табе, што было далей. Мы елі ў рэстаране дзічыну і пілі «Рускую», бо яе вельмі ўпадабалі немцы. Я выконвала ролю перакладчыцы, але не вельмі ўдала, бо шмат чаго забылася. У іх нешта не клеілася, і мой сябар папрасіў у мяне дапамогі. Я быццам бы незнарок правяла пальцамі па валасатай руцэ старога немца. Пасля, ужо знарок, песціла яго ў сваёй пасцелі. Былі крыкі радасці і згамтаная прасціна, была знямога, было храбусценне навюткіх нямецкіх марак і цяжар пакладзеных у далонь пачкаў, аперазаных светла-карычневымі папяровымі стужкамі з чырвонымі палоскамі, было безліч такіх сустрэч і роспач майго сябра, якому я перадумала дапамагчы, бо ўсё яшчэ помніла ягоную абразу з упамінаннем слова «прастытутка»... А вы, журналісты, у гэты час страчылі свае бязглуздыя і нікому не патрэбныя артыкулы пра барацьбу ідэалогій, спрачаліся, хто быў разумнейшы, Пляханаў ці Ленін, Брэжнеў ці Гарбачоў, вучылі людзей, як адрозніваць сапраўднага перабудоўшчыка ад прыстасаванца...

— Чаму ты з'ехала адтуль сюды, на Радзіму? — Я равёў гутарку на другое.

— А куды яшчэ ехаць? Там жа я не магла займацца сваім рамяством. Кожны сабака ведае.

— Ну, а кватэра?

— Што кватэра?

— Абмянялася?

— Купіла.

— Ого.

— Ты павінен ведаць, што людзі нашай прафесіі зарабляюць многа.

— Я ведаю. Але каб кватэру. Яна каштуе дзесяткі мільёнаў.

— Мне прадалі танней. Своеасаблівы падарунак. Я ж абслугоўваю абраных. А хочаш, я паведамлю табе свае расцэнкі. Міньет раблю...

— Не трэба працягваць. Мне гэта нецікава.

— Дарэмна. Выкарыстаеш у артыкуле... І яшчэ. Я ніколі не падпільноўвала кліентаў каля гасцініц або рэстаранаў. Яны самі знаходзілі мяне дома. А сёння... Сёння асобы выпадак. Я табе ніколі не скажу, чаму я паявілася каля рэстарана.

— Не настойваю.

— І добра.

Цяпер яе пагляд быў насмешліва-суровы. Сіняк знік, яго амаль на ўсю даўжыню перакрэсліла блакітная аправа акуляраў. Вераніка ўсё яшчэ змагалася. Яна ўпарта не хацела выклікаць жаласлівасць. Але пытанне, адрасаванае мне пасля хвіліны маўчання-роздуму, прадало яе гэтак жа, як прадаў толькі што попельны «ліхтар».

— А цяпер я хачу спытаць у цябе: ці мае чалавек права на памылку?

— Такое пытанне нельга ставіць, бо ці мае права адзін чалавек вызначаць, дзе зрабіў памылку іншы, і ці памылка гэта наогул. Кожны павінен сам аналізаваць і даваць ацэнку сваім учынкам. Да таго ж любая памылка можа мець апраўданне.

— Ну, добра. А вось ты, асабіста ты апраўдваеш усе свае памылкі?

— Часам апраўдваю, але часцей усё ж проста вытлумачваю для сябе іх паходжанне, не знімаючы гэтым самым з сябе віны. Не вельмі даўно, калі мы, журналісты, адчулі сябе адносна вольнымі, мяне запрасілі на адну важную канферэнцыю. Я адмовіўся. Мне захацелася паказаць, што цяпер магу і не выканаць нечы загад, што я незалежны і сам вызначаю, куды мне ісці. Але ж то быў не загад, а звычайная просьба. Да таго ж, канферэнцыя аказалася дужа цікавай. Я вырашыў, што зрабіў памылку.

— Мне спадабаўся твой адказ, хоць і прыклад, які ты прывёў, мае занадта малы жыццёвы маштаб. Згадзіся, твая памылка непакоіла цябе ўсяго некалькі гадзін, няхай сабе дзён, але яна ніяк не паўплывала на ход твайго жыцця. Ва ўсялякім разе — знешне. Для мяне памылкаю стала само маё жыццё. Вось толькі пазнавата зразумела. Ты вельмі добра сказаў, што кожны чалавек сам найбольш дакладна можа вызначыць ступень сваёй памылкі і сваёй віны. Але ж чалавек па прыродзе эгаіст і заўсёды імкнецца апраўдаць сябе. Я таксама знаходжу апраўданне сваім дзеянням (бывае, нават адношу сябе да ліку ахвяр цяперашняга часу), але чым далей, тым цяжэй і цяжэй мне рабіць гэта.

Мне захацелася суцешыць яе, але замест гэтага я толькі ўскінуў руку і зірнуў на гадзіннік, які паказаў палову на чацвертую. Пачынаўся наступны дзень — 6 траўня 1992 года. Цела не слухалася

мяне. Здавалася, варта мне падняцца, як пакой уздрыганецца ад скрогату знямелых касцей. Гэта азначала, што добрыя дзве гадзіны я правёў у поўнай нерухомасці. Яна адпіла халоднае кавы, прымасцілася на рог століка:

— Хочаш, я раскажу табе адну прытчу. Слухай. Калі чалавек кажа «дай» і нічога не абяцае ўзамен, гэта яшчэ не сталы чалавек. Калі чалавек кажа «дай, я табе адплачу тым і тым», гэта напаўсталы чалавек. Калі чалавек кажа «давай, я зраблю табе добрую справу, а ты мне адплоціш некалі тым жа», гэта блізкі да сталасці чалавек. Калі чалавек кажа «бяры ў мяне, што табе трэба, я зраблю для цябе ўсё, што магу», гэта сталы чалавек.

— Гэта нейкім чынам тычыцца тэмы нашай гутаркі?

— Гэта тычыцца мяне.

— Якім чынам? Я нешта не зразумеў.

— А такім, што прытчу гэтую прыдумала я. Вось і ўсё.

* * *

Не помню ўжо, што гэта быў за дзень і наогул канец траўня ці пачатак чэрвеня дзевяноста другога. Але тое і не важна. Мне трэба было тэрмінова рыхтаваць да друку звесткі пад рубрыку: «Хроніка падзей» (колькі дзён таму пакінуў пасаду аглядальніка і ўзначаліў аддзел аператыўнай інфармацыі). І трэба ж: у самы гарачы час прыпёрліся Мікола і Сцяпан. Натуральна, пісаць у такой абстаноўцы не будзеш, і я ўзяўся, перакідваючыся з імі словам-другім, гартаць свежыя газеты. Узялі па аркушу і госці...

— Андрэй, гэта не пра тую Вераніку, што была тады з намі, пішуць?

— Дзе?

Мікола паднёс да мяне газету і пстрыкнуў здаравенным пальцам па кароценькім паведамленні пад маленькім падзагаловачкам «Забойствы», ад чаго папера трэснула. Трэшчына як бы перакрэсліла падзагаловачак.

«У адной з кватэр дома № 128, што па вуліцы Першамайскай, знойдзены трупы 35-гадовай Веранікі Ламейка (уладальніцы кватэры) і маладога мужчыны прыкладна 23-26-гадовага ўзросту. Асоба апошняга ўстанаўліваецца.

Пацярпеўшыя, як сведчаць вынікі папярэдняга расследавання, атруціліся газам, уключыўшы, кладучыся спаць, усе чатыры канфоркі газавай пліты».

— Так, гэта яна.

— Ого. Добра, што яна не ўключыла канфоркі, калі начаваў у яе ты.

Я ўсміхнуўся:

— Дзякуй ёй за гэта.

І раптам нечага расчуліўся:

— Эх, Веранічка. Вось і пазбавілася ты ад сваёй хваробы.

— Яна была хвораю?

Я зрабіў выгляд, што не пачуў гэтага пытання, хаця мог адказаць сцвярджальна. Я мог нават растлумачыць, чаму яна зацягнула да сябе ў пасцель няшчаснага юнака, якога, напэўна, як і мяне, падцікавала каля гасцініцы або рэстарана. Яна не хацела, каб яе смерць выклікала ў людзей шкадаванне. Гэта была яе апошняя перамога, якую, канечне ж, таксама не прыняў разграфаваны сшытак у белай вокладцы са штучнай скуры. Ён, я ў гэтым быў упэўнены, скончыў сваё існаванне трошачкі раней за гаспадыню.

Нічога не здарылася

Моцны ўдар у пругкую шыбу змусіў пасажыраў аўтобуса здрыгануцца. Усе зірнулі на мужчыну, які сядзеў ля залепленага снежным сейвам акна. Чалавек увесь сцяўся, на яго бляклым інтэлігентным твары выразна праступіў страх.

Але ўжо праз якую хвіліну людзі забыліся на спалоханага мужчыну. Нат калі пасажыраў неўзабаве і папрасілі б узгадаць ягоную знешнасць, наўрад ці хто здолеў бы сказаць што-небудзь пэўнае.

На каленях чалавека ляжаў старэнькі скураны дыпламат аранжавага колеру. На ім — худыя кісці рук з даўгімі вузлаватымі пальцамі.

...Толькі калі аўтобус мінуў наступны прыпынак, чалавек адважыўся зірнуць праз шкло на сіратлівую вуліцу. Якраз перад ягоным тварам бялела на шыбіне снежная пляма. Відаць, нехта хацеў пацешыцца. А можа, тое было зроблена наўмысна, каб лішні раз напомніць, што яго не збіраюцца пакідаць у спакоі і будуць дапякаць яшчэ доўга.

Натуральна, сам па сабе выпадак трывогі ў пасажыра не выклікаў бы. Але гэтаму папярэднічалі падзеі, успаміны пра якія выводзілі яго з раўнавагі. На вуліцы тэмпература была плюсавая, і сплюжаная снежка паціху расцякалася вадзянымі пасмачкамі.

Гэтак і ў людзей: памрэ нехта — спачатку пра яго памятаюць, пасля гэтая памяць паціху сціраецца і, нарэшце, знікае зусім. Быццам і не жыў чалавек на зямлі.

Чыста інтэлігенцкі роздум — ні больш ні менш. Ды яшчэ прыпраўлены меланхоліяй.

Але што, што ўсё ж здарылася? Чаму звычайная снежка выклікала ў ім цэлую плойму ўспамінаў і развагаў, чаму яна напалохала яго? Напэўна ж, не без прычыны. Прычына ёсць. Яна простая. А можа, і не вельмі. Паспрабуй разбярыся...

* * *

Мужчыну, які спалохаўся снежкі, супрацоўнікі рэдакцыі звалі Максімавічам, дома — суседзі і сваякі — Максімам; свае артыкулы ён падпісваў так: «М.Шагалевіч». Або ставіў псеўданім «М.Максімаў» — проста і без выкрутасаў, якіх ён саромеўся.

...Быў першы дзень вясны. Пра гэта сведчылі хіба што лісты календароў. На вуліцы ж яшчэ панавала зіма. Ляжаў досыць тоўсты пласт снегу і дзьмуў такі сцюдзёны вецер, што калі б гэты снег не быў мокрым, ніяк без завеі не абышлося б.

Шагалевіч на канечным прыпынку саскочыў з аўтобуса апошнім. Людзі хутка паразбягаліся хто-куды, а ён яшчэ крыху пастаяў, калі шалёны парыў ветру апёк твар, схамянуўся. Бяклыя вочы пасвятлелі, вусны варухнуліся — вецер падхапіў ледзь чутную фразу: «Ат, ёсць у жыцці і радасць, не адно толькі гора». Выраз жа твару быццам бы дадаваў: шчасце ўжо ў тым, што я жыву, бачу дамы, раўнюткія шыхты таполяў, кармушкі для птушак, адчуваю дотык ветру, іду, баючыся паслізнуцца і ўпасці.

Ён праверыў дзіравыя кішэні — ці ўсё там на месцы: пакратаў кашалёк, скамячыў праязны квіток і выкінуў яго ў сметніцу, пальчаткі... А вось адной пальчаткі не было. Азірнуўся — нідзе не відно. Подбегам вярнуўся да аўтобуса (на канечным ён стаіць доўга), падышоў да свайго месца, дзе сядзеў і, убачыўшы патрэбную рэч, уздыхнуў з палёгкай.

* * *

«Чортава сямейка. Трэба ж было звязацца з ёю. Тут у сабе паспрабуй разбярыся, не тое што ў чужой сям'і. Дык жа — павучаць палез».

Шагалевіч жыў адзін — сям'і не завёў, часу не было — на чужыя праблемы патраціў. Адчыніўшы халадзільнік, дастаў яйка, адламіў кавалачак нарачанскага сыру, пачаў есці.

На ім быў цёмны, паношаны гарнітур, блакітная сарочка і сіні гальштук.

«А ўсё ж... Як трэба было зрабіць?.. Але давай, Максіме, пракруцім з самага пачатку... Злашчасны недарэка-скаржнік завітаў да Івана Іванавіча. І той стары мудрэц адфутболіў яго да мяне: маўляў, Максімавіч якраз займаецца сацыяльнай абаронай асобы, ён і разбярэцца. Але ж якая тут сацыяльная абарона, калі гаворка — пра абарону ад уласнай жонкі. Ды пойдзем далей. Госць паведаміў, што пакуль ён ляжаў у бальніцы, жонка павывозіла з хаты ўсё дашчэнту і падала на развод. Плакаўся: з ім паступілі вельмі жорстка, несправядліва. Здаецца, я вагаўся, ці брацца за гэтую справу, але ён вельмі прасіў. Ды яшчэ й быццам бы незнарок падхваліў — сказаў, што сам ён ніколі не дадумаўся б прыйсці ў рэдакцыю — сябры па палаце параілі, запэўніўшы, што няма больш справядлівай інстанцыі за газету. І ён здаўся. Пайшоў па суседзях, пагаварыў з цесцем, сустрэўся з жонкаю. І сапраўды, нават родны бацька тае нахабніцы характарызаваў майго наведвальніка як чалавека гаспадарлівага і працавітага. Пра яе ж, былую афіцыянтку рэстарана, якая паўгода

таму падпала пад скарачэнне і дагэтуль нідзе не ўладкавалася, гаварылі толькі дрэннае: і выпіць не супраць, і паліць, і з кампаніямі сумніцельнымі водзіцца. Карацей, склалася ўражанне, быццам яна для сямейнага жыцця зусім непрыдатная. І гэта пацвердзілася пад час сустрэчы з самою віноўніцаю. Сімпатычная, хоць і паўнаватая, бландзінка; яна нават і не збіралася апраўдвацца. «Няхай пабегае, патрасецца, дробязнік смярдзючы», — зласліва ўсміхнулася і абыякава махнула рукой, тым самым даючы зразумець, што размова скончана».

Максім Максімавіч запаліў.

«Я пачаў ужо рабіць накіды да артыкула, як раптам пазваніў скаржнік і, паўтарыўшы разоў дзесяць слова «прабач», папрасіў нічога не пісаць. Але чаму? Аказалася, хутка адбудзецца суд і ягоную маёмасць вернуць. Як і трэба было чакаць, маёмасць яму вярнулі, хоць і не ўсю. Што ж да артыкула, дык ён, нягледзячы ні на што, з'явіўся і меў вялікі поспех.

У свой адрас я пачуў нямала кампліментаў, прычым не толькі ад сваіх знаёмых. Але ў дзень выхаду газеты быў і званок зусім іншага кшталту. Нехта на другім канцы провада зласліва прасіпеў: «Слухай мяне, вырадак. Ты сёння дахаты не дойдзеш». І я, азіраючыся, краўся да свайго дома па завуголлях. На наступны дзень званок паўтарыўся: «Дарэмна хаваешся, мярзотнік, ад нас не ўцячэш».

Максім Максімавіч сядзеў нерухома. А ў попельніцы курчыліся ў недарэчных позах тры свежыя акуркі.

«Гэты другі званок быў учора. А сёння — снежка ў акно. Гэтак моцна саданула, быццам атрымаў добрую аплявуху. Каго ж я пакрыўдзіў сваім артыкулам?.. Ведама — яе. А голас жа ў трубцы быў мужчынскі. І снежку гэтак моцна ўляпіць у шкло сваёй выпешчанаю ручкай яна не змагла б. Затое змаглі тыя боўдзілы, з кім яна вадзіла кампанію.

Значыць, помсцяць за яе. І калі так, дык гэта яшчэ не самае страшнае. Куды страшней, калі я, пішучы артыкул, выпусціў з-пад увагі нейкую важную акалічнасць, нечага не ўлічыў. Можа, занадта мелка капнуў праблему і гэтым самым незаслужана пакрыўдзіў гераіню артыкула? Відаць, так яно і ёсць. Тут усё вельмі проста... Як жа я адразу не дапяў: яна, гэтая ветраная афіцыянтачка, і не думала займацца мужавай маёмасцю. Не мяшочніца яна, не «анучніца», як ахрысціў яе ў атрыкуле. Натура не тая, склад розуму іншы. Ёй проста закарцела правучыць свайго мужа, які, з яе пункту гледжання, калоціцца над кожнаю капейчынай, кожнаю анучай... Эх, ёлупень, не дапяў. А цяпер во расплачвайся. І правільна. Так мне і трэба».

Вынесшы сабе прысуд, Максім Максімавіч з нейкай нават палёгкаю пакінуў кухню. І якраз у гэты момант яго запыніў званок у дзверы. «Ну, вось і развязка... Усё складваецца, як ён таго і чакаў... На ўсялякі выпадак зірнуў у вочка. «Го-о, ды гэта наш Васька Тупаў!» Крыху расчараваўшыся, што расплата зноў адкладваецца, паспяшаўся адчыніць дзверы.

— Заходзь, намеснік рэдактара па фотаілюстрацыях плюс заўгар. (Васіль працаваў у рэдакцыі фотакорам і на паўстаўкі вадзіцелем «Нівы», быў хлопцам у дошку сваім, і з яго пасад любілі пакпіць.)

— О, ты ўжо і апрануты. А я думаў, чакаць давядзецца. Пайшлі хутчэй. Шэф пасылае нас на разборку адной справы.

— Дык жа субота.

— Хіба першы раз?

— Іду.

Калі яны ўжо імчалі на старэнькай «Ніве» некуды на ўскраіну горада, Васіль хітра, па-змоўніцку зірнуў на Шагалевіча і чамусьці ні з таго ні з сяго зарагатаў.

— Здурнеў.

— Ты чаму такі бледны? Мо хто напалохаў, вунь твар як выцягнуўся.

— Э-эх, братка, сам я сябе і напалохаў. — Вырашыў выгаварыцца — мо лягчэй стане.

— Як гэта?

— Памятаеш пазаўчарашні артыкул пра развод?

— Ну. Пытаеш яшчэ.

— Не разабраўся я там да канца — дроў наламаў. Цяпер во нехта расплатай пагражае.

— Па тэлефоне?

— Угу. А ты скуль ведаеш?

— Казалі, што дахаты не дойдзеш?..— Тут Васіль не ўтрываў і зноў зайшоўся ад смеху. Рагатаў так, што ажно слёзы нагарнуліся на вочы.— Турак ты дурнаваты. Дубіна. Ну-у, з табой не засумуеш. Цырк на дроце. Анекдот. Гэта ж, гы-гы-гы, я... У-га-га, гэта ж я званіў табе...

Ён смяяўся яшчэ вельмі доўга, а Максім Максімавіч ажно скамянеў. Нарэшце да яго вярнулася мова:

— Не хлусі, не твой голас быў. Я добра памятаю.

— То адкуль тады я ведаю, што табе казалі па тэлефоне?

— І праўда, адкуль?

— Кажу ж — сам я і гаварыў.

— А голас?

— Што голас. Я насовачкаю мікрафон прыкрыў — і ўся музыка.

Максім Максімавіч павярнуў люстэрка, што вісела над галавой, і паглядзеўся ў яго. «Няўжо так нічога і не здарылася?.. Няўжо ўсе мае трывогі, пакуты — пустыя?» А ўголас сказаў:

— Не можа таго быць, каб нічога не здарылася. Ну ніяк не можа быць...

Права на усмешку

А Божачка ты мой, як жыць чалавеку, калі і на радасць, на ўсмешку шчырую і адкрытую ён ужо не мае права. Ненавіснае яно, жыццё такое. Ды хоць бы хто іншы, чужынец які адбіраў тое права, дык жа не — дзіцё роднае. Ну, ці ж не крыўдна, ці ж патрэбна каму жытка такая?

...Агатка калі атрымлівала ў калгаснай канторы пенсійнае пасведчанне, дык вырашыла, што працаваць ужо хопіць. Толькі не падумайце, што палайдакаваць захацела кабета. Не, работы яна ніколі не цуралася. Дзякаваць Богу, усё жыццё на ферме і круцілася. Ды як яшчэ працавала. Ого-го, ніхто гэтак не працаваў, як яна. І «ўдарнікам камуністычнай працы» была, і «заслужанай даяркай»... Ніхто ў гаспадарцы не атрымліваў гэтулькі ўзнагарод, ніхто гэтак не шанаваўся (і ў газетах пісалі-распісвалі, і на ўрачыстасці ездзіла ажно ў Маскву), але ніхто і не працаваў як яна — да знясілення. Вы ж не думайце, быццам бы жывёлагадоўчыя фермы былі заўсёды такія, як цяперака, што і гной з кароўнікаў транспарцёры выносяць, і кароў апараты самі дояць — цягнуць саскі, адно падключаць іх паспявай. Быў жа час, калі ўсё гэта рабілася ўручную. То прыбяжыць ні свет ні зара (якраз самы салодкі сон у людзей у гэты час), падчысціць сваю групу на дваццаць шэсць галоў, саломкаю ці пілавіннем падсцеле, пагладзіць кожную рагулю ўжо тады не зусім каб паслухмянымі пальцамі, і зазвіняць, упіваючыся ў ацынкаванае днішча даёнкі, духмяныя пругкія струменьчыкі.

Аднаго разу прывяла з сабою памочніцу — дачаньку Рытку, якая тады ў восьмы клас хадзіла. Ледзь дабудзілася. А як прыйшлі на ферму, тая ў салому зашылася, і хоць ты ёй стрэльні — слухаць не хоча ні пра якое даенне. З таго часу больш не брала яе. Сорамна было перад іншымі даяркамі, якім часцяком дапамагалі нават малодшыя даецi. Так сама і цягнула гэты нялёгкі груз, бо спадзявацца болей не было на каго. Мужа яшчэ зусім маладою пахавала, калі Рытка ў першы клас збіралася. Адправіла на пачатку лета ў заробкі жывога і здаровага, а пад восень сустрэла мёртвага. Будаўніком быў. Зваліўся з вышыні на кучу друзу і сканаў на месцы. Так сама і выгадавала сваю Рытку, песціла як магла, а цяпер во баяцца пачала крывінкі роднай. Як толькі патэлефануе, што хутка прыедзе, дык аж сэрца зашчыміць: «Лепш бы не ехала, лепш бы я сама спакойна свой век дажыла».

...Не, лайдакаваць для Агаткі — тое самае, што ў труну жыўцом класціся. Намер кінуць працу прадыктаваны зусім іншым: рукі не слухаюцца, баляць нясцерпна штоночы аж да самых плячэй, а пальцы

гэтак пакрывіла (што на руках, што на нагах — там і там адзін на другі залазіць), што не ведае, куды і схаваць іх на людзях.

Во бяда якая.

І як бы ні ўгаворвала цяпер Рытка сваю маці, каб яшчэ крыху папрацавала (не будзе ж адкуль цягнуць, як раней), усё ж вырашыла — хопіць. Не пайшла болей на ферму. А пенсію тую ўсё не нясуць ды не нясуць. Месяц прайшоў, другі, трэці. У кашальку — вецер гуляе. Дачка не заяўляецца. Ды ўсё ж аднойчы на пачатку лета прыкаціла з мужам, маўчуном-боравам, і сынамі-школьнікамі сваім сінім бліскучым «жыгулёнкам» на выхадныя. А тыя ўнучыкі, нібы пеўні, у высокіх спартыўных шапачках, толькі на парог і адразу з пытаннем:

— Баба, ты ўжо пенсію атрымала? (Калі былі меншымі, дык торкалі ёй у жывот ствaламі пластмасавых аўтаматаў і крычалі наперабой: «Баба, дай сто рублёў, а то застлэлім».)

— Не, унучкі, не атрымала яшчэ.

— О-о-о,— крывілі яны вусны.— Ты цяпер нам нічога не дасі.

— Чаму ж не дам? Во, яблычкаў, груш сушаных вазьміце. А во гарбузікаў.

І дзеці лагаднелі. Адно Рытку, трэску тую, не вельмі ўлагодзіш нейкімі там семкамі. Яна безупынку бурчала:

— Я ж казала, не кідай работу. А цяпер во сядзіш без капейкі.

А пасля, нат не прыняўшы запрашэння паснедаць, скамандавала мужу:

— Паехалі ў магазін. Тут у вёсцы можна на такі харошы тавар нарвацца, які ў горадзе разоў у тры даражэй пойдае. Паехалі, мо шчэ ў якую іншую вёсачку заскочым.

Яны ад'ехалі, а Агатка на агарод. Там гарбузы прарастаюць, дык праверыць захацелася, ці не павыцягвала тыя парастачкі вараннё (упякліся ўжо гэтыя надакучлівыя птушкі).

На градах і праўда вытыркаліся то тут, то там па пары цёмназялёных, авальнай формы лісточкаў, сцягнутых зверху светленькімі лупінкамі. Быццам бы маленькія чалавечкі вырашылі распрануцца і ўзнялі ўгару рукі, знімаючы белыя сарочкі. Але так і застылі, трымаючы над сабою апратку. Агатка калі садзіла іх, дык доўга слязьмі аблівалася. Вырые пальцамі ямку, кіне туды рагатае пазубленае зярнятка, сыпне зверху жменькі са тры зямлі. Сыпне і заплача: на вечка труны, пад якім дарагі чалавек ляжаў, таксама тры жменькі зямлі сыпала. Цяпер міжволі па думала: “Ну вось, я вас пахавала, а вы зноў усталі, цягнеце ручанькі да неба. Толькі ты, мой саколе, не ўстанеш, не прарасцеш ужо. Ад нас з табой адно зелле і застанецца”. І

змахнула крывым парэпаным пальцам слязінку з твару, што пачаў маршчыніцца.

...Невясёлыя думкі Агаткі перапыніла Зося — вясковая паштальёнка. Маленькая, сухая, заўсёды вясёлая тараторка.

— Танцуй, мілая, прынесла табе нешта,— засакатала яна, ледзь ступіўшы на ўтравелы падворак.

— Няўжо пенсію? — не ўтрывала, каб не спытаць, Агатка.

— Ды яшчэ якую пенсію. Падстаўляй торбу, бо ў кашалёк не ўлезе.

— То хадзі... Хадзі, Зосечка, у хату.

— Го, не толькі зайду, але і чарку з цябе здзяру. Покуль не нальеш, не аддам грошай. Як сабе хочаш.

— Ці ж я шкадавала калі, Зосечка,— Агатка прапусціла ў хату няўрымслівую госцю.— Садзіся во ў куточку, я зараз.

— Калі б ты шкадавала, я б і не гаварыла так.

На стале з'явілася бутэлька «Белай вежы», сала, кіслая капуста... А Зоська пачала адлічваць грошы, быццам бы раскідвала з калоды карты.

— Во, роўна семдзесят дзве тысячы. Трыццаць шасць зайчыкамі і трыццаць шэсць — рускімі.

— Не можа быць, каб столькі...

— Можа. Гэта ж за чатыры месяцы. А за апошні ўжо ідзе падвоеная.

— Тады давай, Зоська, замочым...

Жанчыны пілі, а грошы ляжалі пасярод стала і радавалі вока. Грошы ляжалі, а жанчыны гаманілі і гаманілі: пра долю сваю гаротную, пра дзяцей, для якіх бацькі — не бацькі, а торба з грашыма.

— Думаеш, шкада мне таго рубля дзецям даць. Не. Крыўдна толькі, што слова добрага ад іх не пачую. Толькі папрокі ды «дай, дай, дай...». Ці то свет такі стаў, ці толькі маё гэткае ўрадзілася?

— Свет сёння такі, мілая. Мае, думаеш, іншыя. Як прыедуць, дык вачыма, здаецца, усю хату абабралі б. Грабуць, грабуць і ўсё мала ім. Але я не такая дурная, як ты. Го, я ім голымі рукамі не дамся. Ніколі не прызнаюся, колькі ў мяне грошай. Прыкінуся, што апошняга «зубрыка» ад сэрца адрываю, і бывайце здаровы. Няблага і так жывуць.

— Вось-вось, што жывуць занадта ўжо прыгожа. Але за што ж яны да нас такія халодныя? Не па-людску робяць, сэрцам чую, што не па-людску. Во і зараз прыехалі, дык ні табе «здрасця», ні «да свідання», а з парога хутчэй: «Пенсію атрымала?»

— Ведаеш, што скажу табе? Не кажы сваім, як прыпруцца, што пенсію атрымала. Ім нашыя грошы пагоды не зробяць, толькі разбэш-

чваюць, а для нас яны — добрая падтрымка. Ды і, Сцяпанаўна, хопіць прыніжацца, даніну плаціць.

— Яно так, Зосечка. Толькі з кім жа яшчэ падзялюся радасцю сваёй. Я ж не ўтрываю. Гэта ж столькі грошай. Ніколі ў мяне гэтулькі не было. Няўжо ж ад дзяцей радасць сваю хаваць.

— Дурнаватая ты, Агатка. Ідзі тады ўжо да суседзяў. Да Мар'ечыхі ці да Камарыхі. Пахваліся ім, адвядзі душу.

* * *

Калі Агатка пасля абеду вярнулася з магазіна, дачка з сям'ёй ужо шнырылі па хаце. Значыць, прыехалі з рэйду свайго закупачнага. Рытка даставала з вялізных, як прорва, сумак усялякія анучы: цэлыя скруткі шкарпэтак, трусікаў, пар дзесяць вастраносых карычневых туфляў, сарочкі, куртку, паліто...

— Гэта табе будзе, чуеш, Коля? Гэта, Саша, табе. Гэта Віцю. Гэта і вось гэта мне, а гэта...

Агатка зірнула на цёплыя дабротныя боты і падумала: «Зараз прапануе іх мне. Бач, а я, зараза такая, схавала ад іх грошы». І старая палахліва зірнула на шафу, у якой тыя грошы ляжалі: «Раптам знайшлі?» Там і праўда ўсё было перакладзена з месца на месца. Але тут Агатка ўспомніла, што перахавала тысячы ў панчоху, якую запхнула пад матрац. «Якая ж я ўсё-ткі нядобрая». І твар яе заліўся чырванню.

Але боты ёй прапаноўваць ніхто не збіраўся.

— ...А гэта ўсё на продаж,— махнула рукою дачка на астатні тавар. І дадала:— От, калі б у цябе, мама, былі грошы, мы б дыван яшчэ купілі. Ну такі ўжо прыгожы дыван выгледзелі. І ўсяго пяцьдзесят тысяч каштуе.

Старой вельмі карцела падняцца ды ашарашыць усіх, маўляў, эге, думаеце, баба такая ўжо і бедная, глядзіце, колькі ёй сёння грошай прыперлі. Хацела парадаваць дзяцей, а разам з імі парадавацца сама. Але змоўчала. Толькі вачыма раз-пораз прабягалася па ложку, дзе пад матрацам ляжала цэлае багацце. А калі госці, павячэраўшы, ад'ехалі, прамармытала сабе пад нос:

— Трэба мне гэтыя грошы. Што мне, у магілу іх браць? — Пасля крыху падумала і дадала: — От, і не трэба, а бач, не дала...

ЗМЕСТ

На горцы
Хуліган
Плюшавае сабачаня
У цягніку
Вар'ят
Ёрчыкаў слуп
Чорная вавёрка
Разграфаваны сшытак у белай вокладцы
Нічога не здарылася
Права на ўсмешку

Літаратурна-мастацкае выданне
ПРАВА НА УСМЕШКУ
Апавяданні
КРЭЙДЗІЧ Анатоль Мікалаевіч
Мінск, часопіс «Маладосць», на беларускай мове
Галоўны рэдактар Г. Дадідовіч
Радактар В. Гардзей
Мастацкі рэдактар В. Казлоў
Тэхнічны рэдактар В. Марычамка
Карэктар Н. Даваль